Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!
Proletariusze wszystkich
Пролетарии всех стран,

САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ

XII год выданьня
Штодзённая газэта

ОРГАН ЭЎТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТАТУ РАБОЧЫХ, СЯЛЯНСКІХ І ЧЫРВОНААРМЕЙСКІХ ДЭПУТАТАЎ І САВЕТУ НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ БЕЛАРУСКАЙ С. С. Р.

ПЯТНІЦА
5 чэрвеня 1931 г.
№ 126 (3214)

Читальный зал Библиотеки Гом. окружкома
Алма-Ата, Ленина 87 Гос. Публич. обл. б-ка Февр.-янв. 1937 г. ICD

Высылка „антыдзяржаўных“ элемэнтаў з Заходняй Беларусі

...ленскі фашысцкі друк зьмяшчае на ...дамленьне аб тым, што мясцовая ...ада, згодна дэкрэту прэзыдэнта поль...ай рэспублікі мае распачаць вялікую ...цыю ачышчэньня Заходняй Белару...сі ад «антыдзяржаўных» элемэнтаў.

У пагранічны пояс унесены Вільня, ...ненска-Троцкі павет, а таксама ўсе ...веты, якія мяжуюцца з СССР. З ...льні па гэтых днях мае быць выслана 70 асоб, якія былі западазроны ў ...муністычнай дзейнасьці і якія ўжо ...сядзелі ў катаржных вастрогах па ...кальны год і цяпер знаходзяцца на ...олі». Высяляюцца таксама з Віль...ні 400 асоб падазроных у «антыдзяржаўнай» дзейнасьці і якія ня маюць ...ежных дакумэнтаў. Усе высланыя ...глыбіню Польшчы будуць знаходзіцца ў лягерах пад спэцыяльным паліцэйскім доглядам. Для высланых ...одзіцца абавязковая прымусовая ...ца ,за якую ніякай платы ня бу...е, а толькі, нібы урад мае даваць ...армовыя» харчы.

Высылка—гэта ня новае зьявішча ў ...ышэцкай Польшчы. На працягу ...ошніх год высялялася цэлыя сем'і ...бочых і сялян Заходняй Беларусі, ...ходняй Украіны, якіх фашысцкая ...ада западозравала ў нелойяльнасьці ...фашысцкай дзяржавы.

Новае ў высылцы тое, што яна ...ымае надзвычайна масавы характар. ...ма ніякага сумленьня, што ў чор...ых сьпісках ахранкі лічацца дзесяткі тысяч рэвалюцыйных рабочых і сялян Заходняй Беларусі непадзейнымі. ...льская ахранка пры дапамозе белару...скіх нацыянал-фашыстаў Луцкевіча, Астроўскіх, Яромічаў, Станкевіча і інш., гэтых шпіёнаў, прадажных агентаў, лёкаеў сусьветнага імпэрыялізму ужо даўно склала чорныя ...пісы лепшых барацьбітоў за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленьне пад ярма фашызма. У гэтыя чорныя ...пісы ўваходзяць ня толькі члены ...амуністычнай партыі Заходняй Беларусі але і былыя грамадаўцы і члены ...варыства беларускай школы, бо гэтыя шматтысячныя арганізацыі рабочых і сялян Заходняй Беларусі фашысцкім урадам абвешчаны па-за законам.

Дзікі разгул белага тэрору, зьдзекі, катаваньні, сыстэматычныя пагромы, наезды крывавых экспэдыцый карных атрадаў і, нарэшце, масавая высылка рэвалюцыйных рабочых і сялян Заходняй Беларусі—ўсё гэта, зьвеньні ў адным ланцугу падрыхтоўкі да ўзброенага нападу на СССР. Польская буржуазія крывавым лютым тэрорам з нябачанай жорсткасьцю падаўляла і падаўляе ўсякае праяўленьне рэвалюцыйнага руху.

Але жорсткай расправай буржуазіі не ўдалося і не ўдаецца задушыць рэвалюцыйнага руху ў Польшчы і на Заходняй Беларусі, не ўдалося і не ўдаецца разьбіць, рэвалюцыйны фронт. Працоўныя масы Заходняй Беларусі адзіным фронтам з пралетарыятам і працоўнымі масамі Польшчы і Заходняй Украіны пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі вядуць упартую барацьбу з фашысцкай дыктатурай за дыктатуру пралетарыяту. Катам, крывасьпійцам не ўдалося зламаць рэвалюцыйнай волі, энэргіі і сьвядомасьці працоўных мас. Суровая расправа і сярэднявяковая інквізыцыя фашыстаў не змагла запалохаць ,не змагла адцягнуць масы ад рэвалюцыйнай барацьбы. Рабочыя і бядняцка-сераднякія масы сялянства Заходняй Беларусі пад кіраўніцтвам сваёй загартаванай у барацьбе камуністычнай партыі ідуць у першых радох поплеч з пралетарыятам і працоўнымі масамі Польшчы, і чым мацней фашысцкі тэрор тым больш загартоўваюцца, тым больш выкоўваюцца барацьбіты за дыктатуру пралетарыяту. І чым мацней тэрор, тым большай нянавісьцю прасякае кожны працоўны да фашысцкага ўраду і да яго лёкаеў сацыял-нацыянал-фашыстаў і яшчэ больш яскравым робіцца для кожнага працоўнага, што толькі нізрынутуюць дыктатуру буржуазіі працоўныя масы дабіваюцца сацыяльнага і нацыянальнага вызваленьня.

Мы ўжо адзначалі на старонках нашае газэты аб Падбродзкай правакацыі польскага фашызму і аб тых масавых аблавах, арыштах, дзікіх катаваньнях у засьценках ахранкі і аб сыстэматычных нападах карных атрадаў на пасобныя раёны Заходняй Беларусі. Гэтыя рэпрэсіі з боку фашысцкага ўраду Польшчы выклікалі рашучы пратэст мільёнаў працоўных БССР, якія ня могуць спакойна глядзець, як зьдзекуюцца, як зьнішчаюць іх братоў па клясе па той бок мяжы. Працоўныя масы БССР добра разумеюць, што ўсе мерапрыемствы фарысцкага ўраду накіраваны на падаўленьне рэвалюцыйнага руху і фізычнае зьнішчэньне авангарду пралетарыяту і працоўных мас—камуністаў, зьяўляецца неадымнай часткай у падрыхтоўцы да крыжовага паходу на СССР.

Фашысцкая Польшча нястрымна шпаркім тэмпам ідзе да катастрофы. Гаспадарчы крызіс з кожным днём усё больш паглыбляецца. Сотні тысяч беспрацоўных, мільёны галодных з кожным днём усё мацней, усё больш рашуча выступаюць з патрабаваньнем работы і хлеба. Фашысцкі ўрад як адзіны мэтад барацьбы з рэвалюцыйным рухам прымяняе тэрор.

Аднак, кулямёты, газавыя бомбы і пэнцыркі, якія штодзень ужываюць польскі фашызм для разгону беспрацоўных, ня могуць стрымаць ,ня могуць прыдушыць, ня могуць зьнішчыць мільённай армії галодных. Заклік камуністычнай партыі Польшчы да барацьбы з дыктатурай беспрацоўя, голаду і вайны знаходзіць з кожным днём усё больш шырокія водгукі сярод працоўных мас Польшчы і яны ідуць пад сьцяг камуністычнай партыі, пад сьцяг рэвалюцыі.

Польская буржуазія пры дапамозе сусьветнага капіталу шалёным тэмпам рыхтуецца да ўзброенага нападу на СССР. Чыстка прымежных раёнаў з БССР ад рэвалюцыйных элемэнтаў азначае што ў падрыхтоўцы да вайны з СССР польская ваеншчына робіць значны крок наперад.

Працоўныя БССР на проіскі польскіх імпэрыялістаў адкажуць—мы на пагатове, мы кожную мінуту гатовы даць руйнуючы, зьнішчальны адпор. Працоўныя БССР яшчэ шчыльней згуртуюць свае рады вакол ленінскай камуністычнай партыі, з яшчэ большай энэргіяй, яшчэ з больш упартасьцю і бальшавіцкай настойлівасьцю будуць змагацца за выкананьне пляну трэцяга рашаючага, яшчэ больш узмацняць абароназдольнасьць нашае краіны.

Польскай буржуазіі і яе лёкаям сацыял-інтэрвэнтам і нацыянал-фашыстам ня ўдасца зьверскімі рэпрэсіямі прыдушыць рэвалюцыйны рух. Грозная сіла пралетарыяту і працоўных мас Польшчы Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны вынесе свой гістарычны прыгавор ў агні клясавых баёў ператвора фашысцкую Польшчу ў Савецкую Польшчу.

Барыкадныя баі ў Гамборне

Гераічны пралетарыят Нямеччыны адбівае атакі паліцэйска-фашысцкай зграі

БЭРЛІН. 4-VI. «Ротэ Фане» паведамляе, што ў Гамборне (цэнтр жалеза вырабляючай і стале-ліцейнай прамысловасьці) адбыўся суд над рабочымі, якія абвінавачваліся ў нападзеньні на гамборнскую ратушу. Суд прыгаварыў абвінавачваемых да многіх месяцаў астрожнага зьняволеньня. Перад будынкам суду і блізкай адлегласьці вуліцах сабраліся вялікія натоўпы працоўных. Раздаваліся выгукі супроць буржуазнай юстыцыі і ў абарону асуджаных рабочых. Паліцыя спачатку была бясьсільна што-небудзь зрабіць. Затым паліцыя ачапіла месца вакол будынку суда і распачала разгон сабраўшыхся.

У Абэрмаркале (раён Гамборна) паліцыя распачала страляніну, параніўшы многіх рабочых. Рабочыя арганізавалі самаабарону. Брук узрыты. Пабудаваны загароды з калючага дроту, каб перашкодзіць праходу паліцыі ў рабочыя раёны. У 7 месцах пабудаваны барыкады. Конная паліцыя, якая разьяжджала па горадзе была спаткана ля барыкад градам каменьняў і вымушана была адступіць. Паліцыя распачала агонь па прахожых. Увечары 3-га чэрвеня цяжка паранены 4 рабочых. Вулічныя баі, якія разгортваюцца, набываюць усё больш сур'ёзны характар, і перакінуліся нават у блізказнаходзячыся Дуйзбург. Памяшканьне камсамолу разгромлена паліцыяй. У Штутбундзе як толькі былі атрыманы весткі аб вулічных баях у Гамборне, тысячы рабочых выйшлі на вуліцу. Ва ўсім горадзе пачаліся дэманстрацыі. Паліцыя нападала на дэманстрантаў, пусьціўшы ў ход карабіны і штыхі. Дэманстранты разьбілі шыбы ў магазынах банкаўскіх будынкаў. Былі разьбіты таксама шыбы ў памяшканьні рэдакцыі органа народнай партыі.

Паводле паведамленьня «Ротэ Фане» учора ў розных раёнах Бэрліну гладуючымі беспрацоўнымі былі разгромлены 4 харчовых магазыны. Апроч таго, была разьбіта частка вялізарных вітрын універсальнага магазыну. У многіх выпадках адбываліся вялізарныя скапленьні праходжых і жонак рабочых. У натоўпу часта чутны былі выгукі адабрэньня. Позна вечарам адбылася наперакор забароне вялізарная дэманстрацыя перад будынкам бэрлінскага муніцыпалітэту. Адбываліся разгромы магазынаў. Выставачные вітрыны былі разьбіты.

Спэцыяльна выкліканыя вялікія паліцэйскія атрады распачалі разгон дэманстрантаў. Паліцэйскія пагражалі рэвальвэрамі з розных месц пачалі страляніну. Паранены 2 рабочых, а таксама некалькі паліцэйскіх. Адначасова ў муніцыпалітэце, дзе абгаварваўся бэрлінскі бюджэт, беспрацоўныя наладзілі дэманстрацыю перарываючы пасяджэньне. Дэманстрацыя беспрацоўных вылілася ў бурны пратэст супроць сацыял-дэмакратычнай фракцыі муніцыпалітэту. Пасьля разгону дэманстрантаў і публікі муніцыпалітэт працягваў пасяджэньне пры зачыненых дзьвярах.

Расьце баявая сіла паўстанцаў Інда-Кітаю

ПАРЫЖ. 3-VI. Увесь друк публікуе паведамленьні аб выступленьні на калёніяльнай камісіі палаты дэпутатаў міністра калёній Рэйно і генэрал-губэрнатара Інда-Кітаю Паське па пытаньні аб рэвалюцыйным руху ў Інда-Кітаі. Рэйно заявіў, што нібы рэвалюцыйны рух наглядаецца толькі ў паўночнай Анаме, і падрабязна гаварыў аб «актах тэрору» і «падпалах» зазначаў, што 1-ае мая ўзброеныя атрады з флагамі і савецкімі эмблемамі правялі рад нападзеньняў і г. д.

Міністр калёній «абвяргаў» паведамленьне некаторых газэт аб расстрэлах мірных дэманстрацый, а таксама адначасова зазначаў, што паўстанцы страцілі 175 чалавек забітымі. Члены калёніяльнай камісіі адобрылі дзействы міністра, які «перад тварам змовы даў неабходныя распараджэньні вайсковым уладам аб ужываньні энэргічных рэпрэсій». Трэба адзначыць, што членамі калёніяльных камісій зьяўляюцца таксама сацыялісты Мутэ і Варэнн.

Орган кампартыі «Юманітэ», абвяргаючы заяву Рэйно падкрэсьлівае, што рэвалюцыйным рухам ахоплены не адзін паўночны Анам, а ўвесь Інда-Кітай. «Юманітэ» адзначае салідарнасьць французкага пралетарыяту з індакітайскімі рэвалюцыянэрамі і зазначае, што апошнія выступленьні па пытаньні аб становішчы ў Інда-Кітаі зьяўляюцца падрыхтоўкай да новых рэпрэсій.

У сувязі з пасяджэньнем калёніяльных камісій «Піці Парызьен», «Фігаро», «Віктуар» і інш. узмацнілі антысавецкую кампанію.

Фашысцкая жандармэрыя расстрэльвае сялян

ВІЛЬНЯ, 4-VI. (Белта). Гэтымі днямі ў вёсцы Чарняева, каля Слабодкі, Браслаўскага павету Заходняй Беларусі адбыліся крывавыя падзеі. Афіцэр жандараў польскай награнаховы 19 батальёну КАП зьявіўся ў вёску п'яным і разам з некалькімі жандарамі пачаў зьдзекавацца над сялянамі.

Сяляне дружна далі адпор і разброілі аватурнікаў. З Другі была выклікана на рота жандараў, якая пачала разганяць сялян. Жандары далі некалькі залпаў у натоўп. Забіты селянін гэтае вёскі Сазон Ермалаеў. Шмат сялян паранена.

Баявая дэманстрацыя беспрацоўных у Вільні

ВІЛЬНЯ, 4-VI. (Белта). Учора ў Вільні адбылася вялікая дэманстрацыя беспрацоўных. Дэманстрацыя беспрацоўных прайшлі праз галоўныя вуліцы Вільні і сабраліся каля будынку ваяводзтва.

Толькі пасьля доўгага супраціўленьня сабраўшыяся беспрацоўныя былі разагнаны вялікімі атрадамі коннай і пешай паліцыі.

Паўстанскі рух у Бірме шырыцца

ЛЁНДАН. 2-VI. Паводле паведамленьня з Бірмы, паўстанчы атрад у 500 чал. напаў на паліцэйскі пост у акрузе Промэ (Бірма). У часе нападзеньня было забіта 10 паўстанцаў. Гэты-ж атрад зрабіў другое нападзеньне ў тым-жа раёне. Забіты начальнік паліцэйскага пасту. Паступаюць таксама весткі аб паўстаньнях ў радзе іншых гарадоў Бірмы.

Мільёны на вайну і...

Фашысцкі ўрад Польшчы ні грошы не адпусьціў на дапамогу пацярпеўшым ад паводкі, а на падрыхтоўку вайны супроць СССР траціцца больш паловы дзяржаўнага бюджэту. Зьнесеныя стратэгічныя масты і дарогі ў час паводкі сьпешна адраманторваюцца. (З газэт).

Высылка—зьвяно ў падрыхтоўцы вайны супроць СССР

ВІЛЬНЯ, 4-V. (Белта). Паводле надзвычайнага распараджэньня прэзыдэнта польскай рэспублікі пачалося масавае высяленьне з Віленшчыны і самога гораду Вільні ўсіх элемэнтаў, якія асуджаны за антыдзяржаўныя «паступкі». Высяленьне адбываецца на тэрмін з 3-х да 10-ці год углыб Польшчы. Высяляемыя будуць там знаходзіцца пад сталым наглядам паліцыі і дэфэнзывы.

Зразумела, што гэтае «ачышчэньне» Віленшчыны і ўсяе пагранічнае паласы ад «небясьпечных» элемэнтаў, так сама як і шалёны тэрор у Заходняй Беларусі, зьяўляецца часткаю падрыхтоўкі да ваеннага нападу на Савецкі Саюз.

Контр-наступ кітайскай Чырвонай армії

ПЭЙПІН, 3-VI. Чырвонаармейскія атрады ў раёне Гуанча правінцыі Цзянсі перайшлі ў контр-наступ на войска нанкінскага генэрала цяпер пагражаюць гораду Нэньпін. Нанкінскае войска зусім дэмаралізавана з-за невыплаты пэнсіі і дрэннага харчу.

МІЖНАРОДНАЯ ХРОНІКА
рэвалюцыйнай барацьбы

⊙ Выдавец штомесячнага часопісу «Цуокерон» адданы пад суд па абвінавачваньню ў зьнявазе японскага імпэратара ў сувязі з тым, што ў красавіковым нумары часопісу зьмешчан артыкул японскага камуніста Сэн Катаяна.

⊙ Як паведамляе «Юманітэ», арыштаваны ў Рубе бастуючыя тэкстыльшчыкі былі зьбіты паліцыяй. Асабліва моцна былі зьбіты 6 рабочых ,якія прайшлі спэцыяльны пакой катаваньняў. Французкі МОПР узяў на сябе абарону зьбітых паліцыяй тэкстыльшчыкаў.

⊙ Міністрам без партфэля Латвійскага ўраду назначан расійскі белагвардзеец Красімаў. Сацыял-дэмакратычная фракцыя сойму ўнесла прапанову аб выказаньні недавер'я новаму міністру. Прапанова была адхілена каліцыйнай большасьцю.

⊙ Рыскі акруговы суд прыгаварыў Эзэрыня да 6 год катаржных работ за прыналежнасьць да кампартыі.

Арганізавана „Белэнэрго“

МАСКВА, 1-VI-31. Энэргацэнтр зацьвердзіў палажэньне аб раённым кіраўніцтве электрастанцыі і сетак па Беларусі «Бэлэнэрго». Кіраўніком «Бэлэнэрго» назначан тав. Шарнёў.

ВСНГ БССР сочыць за выкананьнем «Белэнэрго» прамфінплянаў зацьверджаных Энэргацэнтрам і дае неабходныя дырэктывы. На «Белэнэрго» ускладаецца зацьверджаньне праэктаў энэргаўстановак магутнасьцю да 6.000 кілёват.

МАСКВА, 1-VI-31. Паводле загаду Энэргацэнтру першы Белдрэс прымае ад Энэргабуду ўсе зробленыя будынкі з абсталяваньнем Асінаўскай электрастанцыі, Усе дэфэкты мантажу прад'яўляюцца Белдрэсам не пазьней 1-га жніўня і павінны быць выпраўлены Энэргабудам у тэхнічна магчымы тэрмін. (БЕЛТА).

У барацьбу за лён

ЗАСЕЯЦЬ 240 ТЫСЯЧ ГА ЛЁНУ 40 ТЫСЯЧ ГА НА КАНОПЛІ І НІВОДНАГА ГА МЕНШ

Ленінградзкая і Заходняя вобласьці павінны пачуць адказ на свой заклік аб уключэньні ў лёнапераклічку

Усесаюзнай лёнапераклічцы—увага!

Хто сарваў нараду пры рэдакцыі „Савецкая Беларусь“

Заходняя і Ленінградзкая вобласьці абвесьцілі ўсесаюзную лёнапераклічку. У гэтую пераклічку ўключыліся амаль што ўсе лёнаводныя раёны ССР. БССР у адказ на заклік Ленінградзкай і Заходняй вобласьці, таксама ўключылася ў гэтую пераклічку, але да гэтага часу ніякіх канкрэтных абавязацельстваў, ніякіх сустрэчных плянаў ніводзін лёнаводны раён у ССР ня высунуў.

Друк, у прыватнасьці наша газэта, за апошні час са сваіх старонак неднаразова заклікала лёнаводныя раёны ўключыцца ў гэтую пераклічку канкрэтнымі мерапрыемствамі. Да гэтага часу заклік яны застаецца на паперы.

З мэтай дамагчыся карэннага пералому ў гэтай справе, рэдакцыяй 3-га верасня была склікана нарада зацікаўленых арганізацый аб уключэньні ва ўсесаюзную лёнапераклічку.

Зусім паказальны адносіны тых арганізацый, якія выклікаліся на гэту нараду, да справы лёнапераклічкі, Акрамя прадстаўніка Наркамзему ніводзін з прадстаўнікоў іншых запрошаных арганізацый не зьявіўся на гэту нараду.

Мы лічым, што зрыў гэтай нарады паказвае некалькі такія арганізацыі, як **Галоўленком, Лёнаканоплебуд, Белтэкстыльаб'яднаньне, Белкаапсаюз, Наркамснаб, Белсадсаюз, Наркамфінансаў і Лесбел** аддалі ўвагу лёнапераклічцы, якая мае вялікае значэньне ў сэнсе пашырэньня плошчы пад пасеў лёну і канапель, у сэнсе ліквідацыі прарываў на лёнавым фронце, у сэнсе выкананьня адной з асноўных і важнейшых дырэктыў партыі і ўраду.

Нарада сарвана. Але гэта не аслабяне гэтыя арганізацыі ад адказнасьці за маўчаньне на выклік Ленінградскай і Заходняй вобласьцяй.

У бліжэйшыя дні, рэдакцыя яшчэ раз скліча нараду і даможацца таго стаўлення, каб усесаюзная лёнапераклічцы была б аддана належная ўвага.

Растлумачыць ільготы пасеўшчыкам лёну

Ворша (наш кор.). Раён не зьяўляецца ільнаводным раёнам, толькі таму, што яму надаецца садова - гародны і кывёлагадоўчы напрамак. Усё-ж глебавыя ўмовы дазваляюць і тут займацца ільнаводзтвам і канапляводзтвам.

Па пляну веснавой сяўбы, пасевы лёну і канапель ў раёне прадугледжаны па калгасным сэктары засеяць—лёну 112 га і канапель—553 га, і ў аднаасобным сэктары—1015 га лёну і 132 га канапель, што складае да агульнага пасеўнага пляну ярыны ў калгасах—каля 6 проц. і ў аднаасобным сэктары да 10 проц.

Плошча нязначная, але ўсё-ж такі на патрабуе некаторай увагі з боку Райзямсгасткі і Райкалгассаюзу, а таксама сельсаветаў і калгасаў, каб вызначанае на пляну было выканана.

Тыя лічбы, якія мы маем на сёньняшні дзень, даволі яскрава гавораць нам аб тым, што тэхнічным культурам на Аршаншчыне не надаюць патрэбнага значэньня. Пляны пасеваў лёну ў калгасным сэктары выкананы на 30 мая—на 74 проц. і ў аднаасобным—на 55 проц. і пляны пасеваў канапель—калгасамі выкананы на 3,6 проц. і аднаасобнікамі—на 30 проц.

Калі прыняць пад увагу, што насень лёну і канапель у раёне маецца ў дастатковай колькасьці, дык гэту лічбу патрэбна назваць зусім ганебнай. Пры ўмовах належнай увагі тэхнічным культурам, Аршанскі раён пляны іх засеву можа значна перавыканаць.

Апублікаваная гэтымі днямі ў друку пастанова СНК СССР і СНК БССР пастанова аб дадатковых ільготах пасеўшчыкам лёну і канапель,—на Аршаншчыне да гэтага часу яшчэ не даведзена да мас калгасьнікаў і беднаты і сераднякоў аднаасобнікаў. Значная частка калгасьнікаў і аднаасобнікаў аб гэтай пастанове ня ведаюць.

Сяўба тэхнічных культур па Аршанскім раёне пераходзіць самацёкам.

Трэба каб Райза, Райкалгассаюз, сельсаветы і партыйныя ячэйкі неадкладна разгарнулі масавую работу сярод калгасьнікаў і бядняцка-сераднякіх мас аднаасобнікаў па папулярызацыі пастановы СНК СССР і БССР аб дадатковых ільготах пасеўшчыкам тэхнічных культур, каб дабіцца гэтым самым выкананьня і перавыкананьня пляну па засеву лёну і канапель і каб на сеньне іх не заставалася ляжаць на складах.

А. К.

Пастанова аб ільготах пасеўшчыкам лёну—стымулюе павялічэньне пасеваў лёну

Магілеў, 4-VI (Белта). На раёне засеяна лёну—1160 га, ці—48 проц. пляну. Так, калгасы засеялі — 336 га—44 проц., аднаасобнікі — 820 га,—52 проц. Калгасы Бялевіцкага сельсавету, якія ўключыліся ў пераклічку на аснове сацспаборніцтва, перавыканалі плян на 16 га. Трэба было засеяць 21 га, а засеялі — 37 га. У адказ на пастанову аб ільготах, якія прадстаўлены пасеўшчыкам лёну — пасеўшчыкі засяюць яшчэ больш лёну. Калгасы «Чырвоны партызан» і імя Карла Маркса, Дабрасьвіцкага сельсавету, перавыканалі плян. Першы перавыканаў на 25 проц., другі на 10 проц. Калгас «Іскра»—Гаранскага сельсавету перавыканаў плян—на 20 проц. Калгас імя «1-е мая»—плян выканаў, і абавязаўся звыш пляну засеяць яшчэ 4 га. Калгас «Чырвоны фронт» замест 6 га, засяе—8 га. Калгас «Піянэр» замест 4 га, засяе — 7 га. Калгас «Барацьбіт» высунуў сустрэчны плян засеяць 2 га. Шчажарскі сельсавет заданьне ў 122 га — выканаў.

У барацьбе за ўраджайнасьць лёну!

Забясьпечыць павялічэньне ўраджайнасьці тэхкультур у саўгасах на 35 проц., у калгасах і бядняцка-сераднякіх гаспадарак на 30 проц.

Заданьні засеяць тэхкультуры і павялічыць ураджайнасьць зусім рэальныя, бо яны цалкам забясьпечваюцца патрэбнымі вытворчымі сродкамі.

Падвышэньне ўраджайнасьці тэхкультур забясьпечваецца ня толькі за кошт выбару лепшага месца для пасеваў лёну, (пасьля канюшынішча, новых распашак, пасьля бабовых і абсушных культур), але і за кошт лепшай апрацоўкі і догляду за пасевамі.

І асабліва за кошт выкарыстаньня вытворчых сродкаў, як мінэральныя ўгнаеньні, якія даюць значныя прыбаўкі ўраджаю тэхкультур.

Так, унесеныя 3-4 цэнтнэры суперфасфату даюць прыбаўкі лёнавалакна 1,2 цэнтн. і лёнанасеньня 1,5 цэнтн.

Гэтыя лічбы ведаюць усе раённыя працаўнікі, а масавыя досьледы і практыка саўгасаў і калгасаў пра ўжываньне мінэральных угнаеньняў пад тэхкультуры ўпэўнілі ўсіх калгасьнікаў аб мэтазгоднасьці іх ужываньня.

Але для снабжаючых арганізацый гэта становішча яшчэ незразумела.

Праваапартуністычная стаўка на самацёк, прасоўваньня мінэральных угнаеньняў яшчэ да гэтага часу пануе па некаторых раёнах, у выніку чаго мінугнаеньні ляжаць на складах Райкаапсаюзаў ,на станцыях і нават у некаторых гаспадарках. Ільнаводныя раёны ня цалкам прасунулі мінугнаеньне да калгасьнікаў пад тэхнічныя культуры.

Вось раёны, якія не жадаюць забясьпечыць падвышэньне ўраджайнасьці і не скарыстоўваюць мінугнаеньне:

НАЗВА РАЁНАЎ	Рэалізавана калгасам	Астача на 20-V—31 г.
1. Багушэўскі	350,2	79,6
2. Бешанковіцкі	109,4	266,9
3. Боркавіцкі	1090,5	95,7
4. Ветрынскі	55,5	—
5. Вульскі	142,8	161,1
6. Вушацкі	490,0	74,5
7. Высачанскі	309,1	71,0
8. Гарадокскі	151,0	9,0
9. Горацкі	1166,6	261,0
10. Дрысенскі	304,0	116,0
11. Дубровенскі	407,1	123,4
12. Кармянскі	121,7	106,9
13. Копыскі	375,5	52,9
14. Коханаўскі	435,6	193,2
15. Круглянскі	273,8	191,6
16. Крупскі	19,0	139,5
17. Лепельскі	435,0	245,6
18. Ляднянскі	5,1	99,8
19. Любаньскі	539,0	38,7
20. Мсьціслаўскі	1022,3	732,7
21. Расонскі	208,3	15,0
22. Сеньненскі	1034,3	142,3
23. Сіроцінскі	415,0	85,0
24. Сураскі	415,0	85,0
25. Халопеніцкі	293,7	70,0
26. Хоцімскі	247,3	26,7
27. Чарэйскі	121,7	266,0
28. Чашніцкі	402,5	58,3
29. Чырвон польскі	90,8	516,7
30. Шклоўскі	773,9	115,8
РАЗАМ	11673,9	4625,2

Гэтыя лічбы сьведчаць, што ні для Райза, ні для Райкалгассаюзаў і Райкаапсаюзаў неабавязкова правядзеньне аграмінімуму па тэхкультурах у жыцьцё. Гэтыя арганізацыі не правялі адпаведнай шырока-растлумачальнай работы па ўжыцьці мерапрыемстваў па пад вышэньні ўраджайнасьці лёну і канапель.

Асабліва недаацэньваюць значэньня барацьбы за падвышэньне колькасьці і якасьці тэхкультур раённыя арганізацыі **Бешанковіцкага раёну,** (на складзе 267 тон мінугнаеньняў, а распаўсюджана толькі 109 тон), Вульскага, Кармянскага, Мсьціслаўскага і інш. раёнаў.

Зусім ні якай ролі не надаюць мінугнаеньням і злачынна адносяцца да распаўсюджаньня іх Ляднянскі раён, які распаўсюдзіў усяго 5 тон, а на складах мае 100 тон, Крупскі—распаўсюдзіў 19 тон, а на складах ляжыць 140 тон,—і Чырвонапольскі—распаўсюдзіў 91 тону замест 607 тон. Вышэй адзначаныя раённыя арганізацыі недаацэньваюць палітычнай і гаспадарчай ролі мерапрыемства за падвышэньне ўраджайнасьці, асабліва тэхкультур.

Заданьне па колькасьці і якасьці ўраджаю тэхкультур павінна быць выкананa і перавыканана.

Усякай спробе сарваць падвышэньне ўраджайнасьці трэба даць рашучы ўдар і абвясьціць бязьлітасную барацьбу.

Кесараў.

НА СУСТРАЧ РУХУ ПЕРАДАВІКОЎ--ЗА НОВУЮ ПАЗЫКУ

РАЗГАРНУЦЬ ПАЛІТЫКА-МАСАВУЮ РАСТЛУМАЧАЛЬНУЮ РАБОТУ

Выклікаем на сацспаборніцтва

Агульны сход Саюзу фінансава-банкавых працаўнікоў гор. Магілёву, заслухаўшы даклад аб пазыцы «Пяцігодка ў 4 гады» і выпуску пазыкі 3-га рашаючага году пяцігодкі, пастанавіў далучыцца да голасу рабочых буйных эканамічных цэнтраў і прасіць урад аб хутчэйшым выпуску гэтай пазыкі, датэрмінова падпісаўшыся на месячны аклад зарплаты.

Агульны сход Саюзу пастанавіў выклікаць на панярэднюю падпіску ў разьмеры месячнага заробку. **Швэйную фабрыку, Водны Транспарт, Валакнабуд і Саюзы Дзяржаўных устаноў і Каапэрацыйных працаўнікоў.**

Адначасова сход парашыў выклікаць **Бабруйскі раён і Гомельскі гарсавет** на сацспаборніцтва за лепшае правядзеньне падпіскі: поўны ахоп усіх рабочых і служачых, саматужнікаў, калгасьнікаў на максымальную суму іх заробку, лепшае правядзеньне падпіскі на вёсцы.

Усе фін.-банкаўскія працаўнікі мабілізавалі сябе на правядзеньне масавай растлумачальнай кампаніі ,як у горадзе, так і на раёне.

М. Р.

Разгарнулі масавую работу

На менскай абутковай фабрыцы рабочыя патрабуюць выпуску новай пазыкі імя 3-га рашаючага году пяцігодкі. У зьвязку з гэтым на фабрыцы разгорнута растлумачальная кампанія аб значэньні новай пазыкі. Гэтае пытаньне абгаворвалася на рабочых сходах цэхаў, брыгад і камун. **Ударнік.**

Вітаем прапанову электразаводцаў

Дрыса, 3-VI (Белта). Прафаб'яднаньне працаўнікоў **Дрысенскага** Райкому КП(б)Б і нардому, вітае прапанову электразаводцаў і макееўцаў, і патрабуе ад ураду хутчэйшага выпуску пазыкі.

Шклоў, 3-VI (Белта). Агульны мітынг рабочых папяровай фабрыкі **«Спартак»** патрабаваў тэрміновага выпуску пазыкі 3-га рашаючага.

Пазыка „3-ці рашаючы“—лепшы адказ інтэрвэнтам

Агульны сход студэнтаў **менскага Фінансава-Эканамічнага тэхнікуму** пры НКФ БССР у адказ на шалёную падрыхтоўку сусьветнай буржуазіі да нападу на бацькаўшчыну працоўных усяго сьвету—СССР, просіць урад хутчэй выпусьціць пазыку імя 3-га рашаючага году пяцігодкі. Абяцаем на працягу двухмесячнага летняга перапынку правесьці растлумачальную работу па распаўсюджваньні новай пазыкі з разьлікам завярбаваць кожнаму студэнту падпісчыкаў ня менш як на 50 руб. Да часу ад'езду ў адпачынак абавязуемся правесьці работу сярод прыгараднага насельніцтва Менску на падпіску на новую пазыку.

Разам з гэтым выклікаем пасьледваць нашаму прыкладу **Менскі Пэдтэхнікум, Хэмічны, Палітэхнікум і ўсе астатнія тэхнікумы. Магілёўскія—Земляўпарадкаўчы, Палітыкаасьветны; Аршанскі—Тэкстыльны; Полацкі с.-гас., будаўнічы; Віцебскі—Вэтэрынарны і каапэрацыйны.**

Па даручэньні агульнага сходу:
Асмалоўскі М., Стральчонак С.

Абяцаем падпісацца на новую пазыку

ГОМЕЛЬ. (Наш карэспандэнт). На прадпрыемствах Гомелю праводзяцца мітынгі, на якіх абгаварваецца адозва рабочых Электразаводу і Макееўкі аб выпуску новай пазыкі «3-га рашаючага году пяцігодкі».

Рабочыя патрабуюць ад ураду выпуску новай пазыкі і датэрмінова падпісваюцца на пазыку.

Рабочыя заводу **«Пралетары»** абяцаюць падпісацца на трох і больш тыднёвы заработак. Паміж усімі цэхамі заводу абвешчана сацспаборніцтва на лепшае правядзеньне падпіскі.

Рабочыя фабрыкі **«Вэзуві»** абяцаюць ужыць усе захады да рэалізацыі новай пазыкі сярод рабочага калектыву мэтадамі сацспаборніцтва па між цэхамі, праводзячы работу пад лёзунгам «ніводнага рабочага і работніцы без пазыкі «трэцяга рашаючага году пяцігодкі».

Рабочыя Гомельскага дэпо абяцаюць падпісацца ня менш як на месячны заработак, таксама і рабочыя шчаціннай фабрыкі.

А. Ермакоў.

Рабочыя Белдрэсу патрабуюць

Белдрэс, 3-VI (Белта). На **Белдрэсе імя Сталіна** прапанова электразаводцаў і макееўцаў цалкам падтрымана. Агульны рабочы сход, зьлёт рабкораў і ўдарнікаў і цэхавыя сходы патрабавалі выпуску пазыкі 3-га рашаючага году пяцігодкі.

На штурм, за перабудову работы саветаў

Перавыбары саветаў гэтага году паставілі задачу карэннай перабудовы работы саветаў, павароту іх тварам да вытворчасьці і калгаснага руху, мабілізацыі шырокіх працоўных мас вакол лёзунгаў Ленінскай партыі па сацыялістычнай рэканструкцыі ўсяе народнае гаспадаркі краіны.

Як абстаіць справа з выкананьнем саветамі дырэктыў Ленінскай партыі аб перабудове сваёй работы?

Трэба адзначыць, што хаця ў гэтым напрамку і ёсьць зрух пасьля перавыбараў саветаў, але ўсё-ж такі перабудова работы далёка не разгорнута. Па лініі гарадзкіх саветаў недахопы галоўным чынам, заключаюцца ў тым, што большасьць гарадзкіх саветаў яшчэ і да гэтага часу займаецца выключна разьмеркаваньнем кватэр.

Галоўным недахопам у рабоце сельсаветаў у справе павароту іх тварам да калгаснага руху, зьяўляецца тое, што яны да гэтага часу сваю работу праводзяць не на аснове праяўленьня максымальнай ініцыятывы ў гэтым напрамку і мабілізацыі мас вакол задач сацыялістычнай перабудовы сельскае гаспадаркі. Ёсьць сельсаветы, якія толькі тады пачынаюць работу па калектывізацыі, калі ў сельсавет зьяўляюцца прадстаўнікі ці ўпаўнаважаныя ад раённых арганізацый, а ў далейшым гэта работа пакідаецца «на самацёк».

У большасьці сельсаветаў масавая работа, якая павінна зьявіцца асноўнай формаю мабілізацыі працоўных мас сялянства і савецкай грамадзкасьці вакол задач партыі на вёсцы, знаходзяцца на зусім нізкім ўзроўні.

Сэкцыі пры сельсаветах у значнай частцы бязьдзейнічаюць. Сацспаборніцтва і ўдарніцтва яшчэ ня стала асноўнымі формамі работы сельсаветаў.

У Петрыкаўскім раёне, ня гледзячы на тое, што ўжо прайшло шмат часу ад перавыбараў саветаў, пры некаторых сельсаветах нават арганізацыйна не афармлены сэкцыі. Сельсаветы работаюць бясплянава, работа з беднатой праводзіцца ад выпадку да выпадку, у выніку чаго ёсьць рад фактаў скажэньня клясавай лініі, абароны кулацтва (Хоцімскі раён).

Аднак, рад сельсаветаў сапраўды паказваюць бальшавіцкія тэмпы ва ўсёй сваёй рабоце паступова перабудоўваючы яе і прыстасоўваючы да задач сацыялістычнага будаўніцтва, вядучы рашучую барацьбу з апартуністычнай стаўкай на самацёк, рашуча змагаючыся з кулацтвам, ліквідуючы яго як клясу, на базе суцэльнай калектывізацыі.

Такую бальшавіцкую настойлівасьць праявіў Рубілкаўскі сельсавет, Койданаўскага раёну, які дзякуючы шырокага разгорнутай масавай рабоце, дабіўся 94 проц. калектывізацыі бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. Калгасы гэтага сельсавету павялічылі пасеўную плошчу пад лён на 60 проц. усе галіны работы калгасаў пераведзены на зьдзельшчыну. Дзякуючы добра пастаўленай работы цэлы рад іншых сельсаветаў ужо ў асноўным скончылі калектывізацыю. Гэтыя сельсаветы ўсе палітычна-гаспадарчыя кампаніі ў сваёй штодзённай рабоце ўвязалі з пытаньнем калектывізацыі. Сельсаветы Лоеўскага раёну заключылі паміж сабою сацдагаворы на скарачэньне тэрмінаў сяўбы.

Мы маем у кожным нумары газэты цэлы рад матар'ялаў аб перабудове работы сельсаветаў, але наогул трэба сказаць, што мы рашуча за гэтую справу яшчэ не ўзяліся. Трэба пакласьці канец гэтай непаваротлівасьці. Дырэктыву нашай партыі трэба выканаць ў найлепшы час. Трэба каб ўсе арганізацыі зьверху і да нізу ўзяліся за перабудову работы саветаў. Мала таго, каб толькі прыехаць у сельсавет запытацца «як справы» і паехаць, а трэба дабіцца таго, каб кожны работнік адчуваў на сабе адказнасьць за работу савета, лічыў сваім абавязкам дапамагчы савету, сэкцыі, дэпутацкай групе перабудаваць работу і практычна ўдзельнічаў-бы ў іх.

Гарсаветам, РВК і сельсаветам трэба мабілізаваць увесь актыў на дапамогу сэкцыям і дэпутацкім групам. Пры цэнтральных установах і РВК трэба стварыць інстытуты грамадзкіх інструктароў. Па прыкладу гарадзкіх прадпрыемстваў трэба абмяркаваць і прыступіць да арганізацыі дэпутацкіх груп у буйных саўгасах і калгасах.

Зварот рабочых, работніц Віцебскай швэйнай фабрыкі «Сьцяг індустрыялізацыі», які апублікаван у «Сав. Беларусі» кладзе пачатак агульна-штурмоваму паходу за перабудову работы саветаў. У гэты паход павінна ўключыцца ўся пралетарская грамадзкасьць БССР.

Адамчук.

Зламіць супраціўленьне справе беларусізацыі

„Вялі адзяржаўны шавінізм знаходзіць сваё выяўленьне ў адмаўленьні беларускай нацыі, у адмаўленьні беларускай мовы, у пагардлівых адносінах да мовы, у актыўным і пасыўным супраціўленьні справе беларусізацыі"

(З пастановы кастрычнікавага пленуму ЦК КП(б)Б).

Біць па канкрэтных зрыўшчыках беларусізацыі

Яшчэ ў студзені месяцы гэтага году Бюро Аршанскага Райкому партыі, праверыўшы становішча беларусізацыі ў раёне, адзначыла, што ажыцьцяўленьня рашэньняў Кастрычнікаўскага Пленуму ЦК КП(б)Б у галіне беларусізацыі ідзе вельмі марудна.

Здавалася, што пасьля такой рэзалюцыі павінны былі заварушыцца ўсе партыйныя і прафсаюзныя арганізацыі раёну.

Аднак, у Аршанскім раёне агрымалася на справе ня так. Належнага зруху ў галіне беларусізацыі ўсе яшчэ няма. Пастанова РайКК РСІ аб прыцягненьні да адказнасьці работнікаў Райвыканкому і ЦРК, якія і самі ня выканалі дырэктыў партыі па беларусізацыі і не дабіліся гэтага ад апаратаў РВК і ЦРК, таксама ня выканана, не прыцягнуты да адказнасьці і прафкіраўніцтва і бюро партыйнай ячэйкі пошты за адсутнасьць работы па ажыцьцяўленьні рашэньняў партыі па нацыянальным пытаньні. У Аршанскім раёне атрымалася, так, што ўсё гаварылася і выносіліся пастановы і рэзалюцыі а помнілі аб гэтым толькі ў час месячніка беларусізацыі, а пасьля аб гэтым усе забыліся.

На сёньняшні дзень, на больш буйных прадпрыемствах раёну—як на чыгуначным вузьле, на мясным камбінаце і на чыгуналіцейным заводзе «Чырвоны Змагар» рашэньні партыі па нацпытаньні ў жыцьцё не праведзены. На мясным камбінаце, як і раней ігнаруюць белмову Большасьць адказных работнікаў белмову ня ўжываюць і нават перапіску вядуць на расійскай мове. Партыйная ячэйка і фабком ніякай растлумачальнай работы сярод рабочых амаль не вядуць, у галіне вывучэньня пытаньняў нацпалітыкі. Між тым рабочыя на мясным камбінаце розных нацыянальнасьцяй і сыстэматычная работа па інтэрнацыянальным выхаваньні тут вельмі неабходна.

Такое-ж становішча мы маем і на заводзе «Чырвоны змагар». Тут таксама пытаньнямі нацпалітыкі і прапрацоўкі іх у масе рабочых не займаюцца, вынікам чаго ў красавіку месяцы мелі месца выпадкі шавіністычных выступленьняў з боку рабочага зйрэя Рудзіна і з боку рабочага палякa—Бароўскага.

Аршанскі чыгуначны вузел у галіне беларусізацыі цягнецца ў хвасьце асатніх прадпрыемстваў. Там беларусізацыя ня толькі не ўкаранена, але супроць яе выступаюць і некаторыя партыйцы і камсамольцы. Быў нядаўна выпадак, калі кундуктар-камсамолец Палявод патрабаваў ад выкладчыка на паліт-занятках гаварыць па расійску.

— Я нічога не разумею на беларускай крычыць Палявод. Кажэце па расійску, а калі заняткі будуць праводзіцца на балмове,—дык я ня буду іх наведваць.

І камсамолец Палявод пакінуў заняткі палітгуртка, каб толькі ня мець справу з белмовай. Да гэтага часу з у Аршанскім раёне яшчэ не праведзена ў жыцьцё пастанова Райкому аб стварэньні пры Райвыканкоме Нацыянальнай камісіі. Яна ўсё яшчэ ў праекце. Гэты прыклад кажа за тое, што пытаньне нацпалітыкі пастаўлена ў рад другарадных пытаньняў.

Райкому партыі трэба арганізаваць сталы кантроль над выкананьнем рашэньняў партыі па нацпытаньні Трэба ня толькі выносіць пастановы, але і прыцягнуць да адказнасьці тых, хто рашэньні партыі па нацпытаньні ігнаруе.

Сёмкін.

Праверка, якая не дала вынікаў

Барацьба з шавінізмам розных калераў павінна быць неадымнай часткай штодзённай работы ўсіх партарганізацый.

Але, у Петрыкаўскім раёне гэтага не назіраецца.

Амаль ўсе ўстановы Петрыкаўскага раёну як у цэнтры раёну, так і ў сельскіх мясцовасьцях ня ўжываюць беларускай мовы. Нідзе ня пачуеш беларускай гутаркі, і ніхто на гэта ня рэагуе.

У Леспрамгасе нядаўна адбылася праверка становішча беларусізацыі, але праверка выявіла, што ў Леспрамгасе, белмову ведаюць вельмі слаба і ня ўжываюць яе ў гутарцы.

Але-ж практычных прапаноў па зьнішчэньні гэтых недахопаў камісія ніякіх не вынесла, нават і тэрмінаў ня дана для вывучэньня белмовы.

Калі запыталіся намесьніка дырэктара Леспрамгасу чаму вашы работнікі не ўжываюць белмовы, дык ён адказаў: «У нас усе гавораць на белмове, але бываюць і памылкі».

У гарпо і Райсаюзе адказваюць, што «пісаць мы ўжо прывыклі, а вось гаварыць па-беларуску ніяк ня можам».

Прыкладаў ігнараваньня белмовы можна прывесьці шмат, але і прведзеныя факты яскрава даводзяць аб тым, што беларусізацыя ў Петрыкаўскім раёне у заняпадзе.

Петрыкаўскаму РК КП(б)Б неабходна прыняць тэрміновыя меры да ліквідацыі буйнейшых прарываў у галіне беларусізацыі.

А. Курдо.

Выкрыць твар загадчыка

Загадчык Сьмілавіцкай яўрэйскай 7мі годкі Зак катэгарычна адмаўляецца гутарыць па беларуску, ён гаворыць выключна на «чиста» расійскай мове, гаворачы, што «расійская мова больш багатая». Калі яму было даручана праверыць беларусізацыю ў арцелі «Камунар» ён прышоў да арцельшчыкаў і сам пачаў гаварыць па-расійску і толькі пасьля настойлівага патрабаваньня з боку саматужнікаў ён перайшоў на беларускую мову.

Новыя беларускія кніжкі «літаратурная чытанка» былі ў продажы ў Сьмілавіцкай кнігарні яшчэ ў студзені месяцы 1930 г., але заг. купіў іх толькі ў канцы сакавіка 1931 г. адгаварваючыся, што «быта ў яго няма грошай, у той час калі для яўрэйскіх і расійскіх кніг чамусьці грошы знайшліся. Замест новых падручнікаў ён раіў скарыстаць забароненыя кн'жкі «Родныя Шляхі». За час двухгадовага прабываньня т. Зака на пасадзе загадчыка школы, школьная бібліятэка абагацілася на 1138 кніг, але цікава, што большасьць кніжок у ёй расійскія. Амаль у тры разы больш закуплена расійскіх кніг за беларускіх. Нават расійскіх кніг закуплена больш чым яўрэйскіх. За 1929-30 г. і 30-31 г. закуплена яўрэйскіх кніг 479, беларускіх—164 і расійскіх 495, за апошні 1930-31 г. было закуплена яўрэйскіх кніг—150, беларускіх толькі 68, а расійскіх—1930. Гэта сьведчыць аб нежаданьні заг. школы Зака укараняць беларускую літаратуру ў школу.

Органы Наркамасьветы павінны зацікавіцца гэтай справай.

Лёгкі кавалерыст.

Работа сярод нацменшасьцяй у заняпадзе

Барацьба з вялікадзяржаўным шавінізмам зьяўляецца адсталым участкам работ у Ветрынскім раёне. Пастановы партыі аб нацпалітыцы не прапрацаваны сярод партыйцаў ужо не кажучы аб калгасьніках і бядняках—серадняках аднаасобніках.

На раёне маюцца досыць значныя групы нацменшасьцяй: палякаў, яўрэяў, літоўцаў, з якімі не вядзецца ніякай работы на іх роднай мове. Маючыяся 2 яўрэйскія і 1 польская аднакамплектовыя школы на ўвесь раён далёка не ахопліваюць усіх дзяцей гэтых нацыянальнасьцяй.

Большасьць працаўнікоў раёну ведаюць белмову, але мала ёй карыстаюцца, асабліва ў штодзённым ужытку. Па ўсім раёне няма ніводнага гуртка па вывучэньні белмовы.

Некаторыя работнікі ўпарта ігнаруюць усе пастановы партыі аб беларусізацыі. Так, напрыклад, Талер бухгальтар саўгасу «Баноль» кажа: «изучать белорусский язык считаю лишним, так как сижу на цифрах и долго жить в Белоруссии не буду».

Служачая пошты Патапава таксама не жадае вывучаць белмовы бо..., «мне приятнее и легче рассуждать на русском языке, чем на каком то белорусском».

Ад загадчыка аргаддзелу РК КП(б)Б тав. Усенкі, які доўга жыве на Беларусі і некаторых іншых адказных працаўнікоў ніколі не пачуеш ніводнага слова на беларускай мове.

У мястэчку Бабінічы, дзе жыве шмат яўрэяў заўважана некалькі праяў антысэмітызму, нават у школе сярод вучняў.

Газэты, часопісы і іншая літаратура на мове нацменшасьцяй, у раёне не распаўсюджваецца. Некаторыя школы яшчэ ўжываюць забароненыя падручнікі са шкодным нацдэмаўскім зьместам.

Трэба з карэньнем выкарчаваць апартуністычную недаацэнку нацпытаньня, якая пануе ў Ветрынскім раёне з боку партыйных і савецкіх арганізацый.

Я. Знаёмы.

Рабкоры паказваюць прыклад,

як трэба ажыцьцяўляць дырэктывы партыі аб беларусізацыі

(Ад нашага Жлобінскага кар.).

Ужо больш [illegible] месяцы Бюро Жлобінскага РК КП(б)Б зьбіраецца разглядзець пытаньне аб становішчы беларусізацыі ў раёне і ніяк ня зьбярэцца, між тым у раёне ёсьць шмат прарываў на гэтым важнейшым вучастку работы.

У значнай частцы ўстаноў раёну белмова ўжываецца фармальна—пішуць на белмове, а гутарку вядуць амаль усе на расійскай мове.

Яшчэ горш справа з беларусізацыяй на чыгунцы. На раённай канфэрэнцыі Саюзу чыгуначнікаў начальнік раёну Бойка заявіў:

— Чыгунка зьяўляецца цэнтралізаванай — мае сувязь з Масквой, таму на чыгунцы беларусізацыі ня трэба праводзіць ці праводзіць, але не так хутка.

Вучань ФЗУ Дзяненчук—камсамолец супроць белмовы, супроць газэты «Чырвонай Зьмены».

Погляд начальніка раёну і іншых работнікаў чыгункі — мае ўплыў на паасобных чыгуначнікаў. Так, у Асіповічах машыністка Глухавіч Н. адмовілася друкаваць патрэбныя матар'ялы на белмове.

Справу беларусізацыі—справу правядзеньня ў жыцьцё нацпалітыкі трэба рушыць уперад.—Рабкоры і ўдарнікі Жлобінскага вузла на вузлавым зьлёце ўзялі на сябе абавязак да Ўсебеларускага зьезду рабселькораў арганізаваць у кожным цэху ў кожнай зьмене гурткі белмовы і гурток па вывучэньне польскай мовы.

Ян. Самаль.

За ленінскую нацпалітыку

Лоратварыць БССР у тапфіны Донбасу

Вышэй тэмпы здабываньня торфу

На 30-V трэба здабыць 2.176.000 цэглаў. Здабыта 23.374.000, або 25,4 проц.

На 31-V трэба здабыць 96.565.000 цэглаў. Здабыта па 3 заводах 508.000 цэглаў, або 0.52 проц.

На 1-VI-31 г. трэба здабыць 100.954.425 цэглаў торфу. Вестак аб здабычы з заводаў няма

ЧАКАЕМ АДКАЗУ

Эльвод, дай грамадзкую дапамогу „Чырвонаму сьцягу"

Гэтымі днямі ў нашай газэце быў зьмешчаны артыкул аб становішчы торфаздабываньня на заводзе «Чырвоны Сьцяг». У гэтым-жа артыкуле ўзьнімалася пытаньне аб тым, каб Эльвод, які будзе карыстацца торфам гэтага заводу, дапамог-бы яму ў ліквідацыі прарыву, які стварыўся за апошні час на ім.

Наш супрацоўнік зьвярнуўся да адміністрацыі і прафарганізацыі Эльводу з просьбай адказаць на артыкул, зьмешчаны ў нашай газэце. Намесьнік дырэктара Эльводу тав. Рак адказаў:

— Мы нічога ведаць ня хочам, Белторфаб'яднаньне, якое заключыла з намі ўмову, павінна нам даць гэты торф, а з заводам «Чырвоны Сьцяг» мы нічога агульнага ня маем...

Акрамя таго, Рак аўтарытэтна заяўляў аб тым, што ніякага нават дагавору з адміністрацыяй «Чырвонага Сьцягу» Эльвод не заключаў.

Як нам удалося высьвятліць, Эльвод заключыў лёкальны дагавор з заводам «Чырвоны Сьцяг» на дастаўку 27.000 тон торфу.

Зусім зьдзіўляе такое становішча, калі нам. дырэктара ня ведае аб тым, з кім заключана ўмова і хто дастаўляе торф.

Мы лічым, што партыйная арганізацыя Эльводу, яго грамадзкасьць змогла ацаніць па заслугах такія адносіны адміністрацыі да такой важнай работы, як забесьпячэньне Эльводу палам.

«Чырвоны Сьцяг» першы год прыступае да распрацоўкі торфу. Прарыў, які атрымаўся спачатку яго работы, вельмі значны. «Чырвоны Сьцяг» адчувае патрэбу ў буксірыі і гэтым бук сірам павінен быць Эльвод.

Чакаем адказу.

П. М.

Торфасэзон на Сеньненскіх балотах зрываецца

Шпаркі рост нашай прамысловасьці патрабуе неадкладнай забясьпекі ле апалавымі матар'яламі.

Мясцовыя запасы торфу ў Сеньненшчыне даюць магчымасьць ня толькі забясьпечыць мясцовую прамысловасьць дастатковым якасным апалам, але нават перакінуць яго і ў іншыя прамысловыя цэнтры. Якасных тарфяных балот у Сеньненскім раёне шмат, але торфараспрацоўка пачата Сеньненскім прамкамбінатам вельмі позна і вядзецца марудна.

Калі ў 1930 годзе мы назіралі значныя посьпехі (плян быў перавышан на 30 проц.), дык у 1931 г. мы сталі перад пагрозай зрыву.

Падрыхтоўчая праца да торфасэзону г. г. правалена. Плянам прадугледжаны пуск на заводзе новага прэсу з прапускной здольнасьцю 75.000 цэглаў, а прэса гэтага на сёньняшні дзень няма.

Рабочымі торфазавод не забясьпечан і мер у напрамку забесьпячэньня прамкамбінат ня ўжыў. Апалавы матар'ял для машыны не загатоўлены, карчы яшчэ ня рэжуцца ,ад хворасту не ачышчаюцца, пад'язныя дарогі няспраўныя.

Студня, адкуль бярэцца вада для падачы, не ачышчана. Для забесьпячэньня рабочых прадуктамі на торфазаводзе не арганізаваны ларок.

Усё гэта сьведчыць аб тым, што плян вырабу торфу на 1931 г. зрываецца.

Патрэбна зараз адпаведным органам зьвярнуць увагу на становішча торфараспрацовак у раёне і вінаватых у зрыве прыцягнуць да адказнасьці.

Зьмітрок.

Утворым баявы аўтадораўскі фонд матарызацыі пагран-войск Саюзу ССР

(З адозвы ЦП Аўтадору БССР)

СССР нябачанымі ў сьвеце тэмпамі будуе сацыялізм. Пяцігодка сацыялістычнай індустрыялізацыі краіны і калектывізацыі яе сельскай гаспадаркі выконваецца з выключным посьпехам, выклікаючы шалёную нянавісьць і злабу ворагаў за мяжой і ўнутры краіны.

Капіталістычны сьвет, разьдзіраемы ўнутранымі супярэчнасьцямі, перажываючы жорсткі эканамічны крызіс, рыхтуе новую інтэрвэнцыю супроць Савецкага Саюзу.

Будуючы сацыялізм, працоўныя Савецкага Саюзу аддаюць многа энэргіі і ўвагі ўзмацненьню абароназдольнасьці краіны і пасіленьню баявой магутнасьці Рабоча-Сялянскай Чырвонай арміі.

Аўтадор аднэй з сваіх задач ставіць усямерную дапамогу ўзмацненьню тэхнічнай магутнасьці Чырвонай арміі, рыхтуючы ў сваіх гуртках і на курсах тысячы вадзіцеляў аўтамашын, дарожнікаў матацыклістаў і г.д., укараняючы элемэнты вайсковых ведаў у вучобу ўсёй масы аўтадораўцаў.

Абвешчан Цэнтральным Праўленьнем Аўтадору БССР збор сродкаў у фонд шасьцікалёсных аўтамабіляў для Чырвонай арміі прайшоў па БССР з вялікім посьпехам.

Зараз таварыства «Аўтадор» ставіць перад сабой новую адказнейшую задачу—**утварыць баявы аўтадораўскі фонд матарызацыі пагранічных войск БССР.**

Шырокая савецкая грамадзкасьць да гэтага часу яшчэ мала ведае аб гераічнай рабоце тых, хто ахоўвае межы пралетарскай краіны на вялізарных абшарах СССР і БССР.

Ахоўваць савецкую мяжу—гэта значыцца сваячасова адхіляць і ліквідаваць усе спробы з боку ворага нанесьці якую-б то ні было шкоду Савецкаму Саюзу.

Ахоўваць савецкую мяжу—гэта значыцца быць на перадавых пазіцыях тварам да твару са зьлейшымі ворагамі рабочае клясы.

Работа чырвонага пагранічніка—гэта суцэльны фронт і ў мірны час. Савецкая грамадзкасьць павінна ўзмацніць свае клопаты аб чырвоных пагранічніках.

Матарызуючы Чырвоную армію, шырокія масы працоўных абавязаны забясьпечыць матарызацыю і мэханізацыю яе пагранічных часьцей.

Аўтадор бярэ на сябе ініцыятыву ў гэтай справе.

Цэнтральнае праўленьне Аўтадору БССРдля ўзмацненьня тэхнічнай магутнасьці пагранвойск СССР і БССР усімі відамі сухаземнага і воднага мэханізаванага транспарту — пастанавіла абвесьціць спэцыяльны збор сродкаў для гэтай мэты сярод шырокай савецкай грамадзкасьці.

Для правядзеньня кампаніі па стварэньні фонду матарызацыі пагранвойск СССР і БССР арганізаваны спэцыяльны камітэт. У склад камітэту ўвадзены працаўнікі савецкіх і грамадзкіх арганізацый, а таксама Чырвонай арміі.

Цэнтральнае праўленьне Аўтадору БССР пераключае ўвесь збор сродкаў у фонд шасьцікалёсных аўтамашын у фонд матарызацыі пагранвойск СССР і выказвае ўпэўненасьць, што шырокія масы савецкай грамадзкасьці дапамогуць Аўтадору з посьпехам выканаць тую вялікую задачу, якую таварыства Аўтадор паставіла перад сабой, прыступаючы да збору сродкаў на матарызацыю і мэханізацыю пагранвойск СССР.

Камунальнае будаўніцтва павялічваецца

Бабруйск. 2-VI. (Белта). У бягучым годзе па горадзе разгарнулася вялікае камунальнае будаўніцтва. Ужо заканчваецца пабудова бальніцы, гарадзкога тэатру і дому-калектыву. Будаўніцтва мяркуецца скончыць, у бягучым годзе. У пабудову бальніцы ўкладаецца 980.000 руб., тэатру—260.000 руб., дому калектыву—700.000 руб.

У рудных балотнага вугля

І. „Буза, таварыш мэханік!"

Брыгадзір вёў нас па вузкай бярвенчатай сьцежцы перакінутай праз балотную цаліну. Там, дзе бярвенчатая сьцежка канчалася, пачалася зьмейкай віцца ўтрамбаваная дарожка сярод купінак балота. Фармовачную машыну відаць адсюль, але да яе яшчэ далёка. Мы яшчэ доўга ішлі па спружыністай глебе балота, пакуль вымалявалася будка з вострым жураўлём, якая напамінае пад'ёмны кран экскаватара. Здалёк бліскчэла вада ў кар'еры і ў доўгіх канавах магістралі.

Насустрач да нас ішоў чалавек у акулярах, з тонкай папкай ў руках. Ён спыніў нас, сьцёр далонью пот з загарэлага твару, хацеў нешта сказаць, але закашляўся. Брыгадзір спытаўся:

— Як справы?

— Буза!

— Не пайшла?

— Не, не пайшла. І ня пойдзе. Гэта не машыніст... Яму-б зазыгалкі зьбіраць, а ён да машыны лезе... Буза...

Сёньня павінна была быць пушчана другая фармовачная машына з тых 5, якія намечаны па плане да пачатку торфа-сэзону. Арматура на месцы, мэханік тут, зборка пачалася даўно, а звычайныя балты, гайкі, дробныя часткі і нявопытнасьць машыніста-мэханіка адцягваюць пуск машыны ў тэрмін.

— Еду ў цэнтральны пасёлак—ускваляваны кідае чалавек у акулярах—дзесятнік Сьнежаньскага вучастку—зьбяру можа некаторыя часткі... Ну і буза, скажу я вам—і амаль не разьвітаўшыся пайшоў.

Слова «буза», слова, якое зараз амаль што выйшла з ужываньня, тут пайшло ў ход. «Буза»—гавораць гады, калі па ўсім торфазаводзе «Чырвоны Сьцяг» замест—5 фармовачных машын працуе толькі 1, замест 800 рабочых—250, замест дзесятага здабываньня 64.000 цэглаў торфу—толькі 30.000.

Ідзем ланцужком далей Брыгадзір наперадзе. Ён нібы ў апраўданьне на дарозе расказвае.

— А як мы рыхтаваліся да сэзону? У сьнежні леташняга году завод атрымлівае разнарадку на паравыя машыны. У стулзені з трэсту паперка «разнарадку адмянена, будзеце браць машыны ў іншым месцы». Добра, у сакавіку зноў новая буза. «Машыны не атрымаеце». 15 разоў езьдзілі у Зембін за катламі. Зембінскі РВК так ўпёрся, што справа дайшла да СНК. З сакавіка цягнулі бузу. Толькі сёньня вязуць лёкамабіль.

Перасканаваючы праз канавы, балянсуючы сярод вузкай зьвілістай сьцежкі балота мы прабраліся да першай фармовачнай.

Лёкамабіль сіпла з пераўвялічаным шумам рухае грабяні элеватара. Лёкамабіль, будка надбудаваная над ім, і ўсё балота ля кар'еру дрыжыць і гойдаецца пад нагамі.

У кар'еры брыгада тарфянікаў. Пад кідвае тарфяную масу на стужку элеватара. Раптам стужка спынілася. Матор прадоўжае шумець. Тарфянікі апускаюць лапаты. Па транспарцёру рухаюцца апошнія цэглы торфу. Чутны галасы.

— Газу не хапае, таварыш мэханік!

— Па чайнай лыжычцы корміш!

— Садзіся, хлопцы, закурвай!..

— Чаго садзіся, напрацаваліся?

— Не работа, браточкі, а буза!

Чаму стаяць машыны? Ці часта стаяць?

Старэйшы брыгадзір тлумачыць «бузу»:

— Ну, як даць 32 цэглы (32.000), калі кожную хвіліну стаім. Ды апроч таго, ці-ж гэта работа? У маёй арцелі толькі 2-3 тарфянікі, іншыя народ новы, першы раз у кар'еры. А вось у іншых брыгадах па 12 чал. бранскіх тарфянікаў. Якая такая пасьля гэтага работа будзе? Ці-ж так скалочваюць брыгаду? А працуе мая брыгада такімі тэмпамі, што спаць хочацца. Поркае рыдлёўкай, як у носе. Учора вось 15 цэглаў далі (15.000). Гэта-ж курам на сьмех. Буза.

— А колькі ў вас ударнікаў?

Гэтае пытаньне прымусіла брыгадзіра задумацца. Ён палёў вачыма па кар'еры, нібы шукаючы гэтых ударнікаў сваёй брыгады, павярнуў галаву і сказаў:

— Ніводнага. Якія тут ударнікі, ай!..

Я успомніў.

Учора ў пасёлку ля ўваходу ў сталоўку бачыў прыбіты плякат, на плякаце было напісана:

«Надаючы вялікае значэньне, якое сацспаборніцтва і ўдарніцтва, мы рабочая брыгада т. Процька абвяшчаем сябе ўдарнікамі і выклікаем на сацспаборніцтва ўсе брыгады па наступных пытаньнях:

1. Павялічыць норму выработкі і на лепшыць яе якасьць;

2. Весьці барацьбу з прагуламі і рвацтвам;

3 Замацавацца да канца сэзону».

Плякат зьліняў ад сонца і вьцьвіў. Аб плякаце мы гаварылі ў канторцы заг. вучастку.

— ... і як працуе брыгада Процька?

— Ды так, як і раней. Ледзь дае 15 у зьмену.

— Які яны ўзялі абавязак

— Лічбы не далі.

— А прагулы?

— Прагулы, прагулы яшчэ ёсьць...

— А хто адгукнуўся на выклік?

— Пакуль ніхто!

Апроч апошняга пункту абавязацельства, у якім ёсьць абяцаньне зама цаваць сябе да канца торфасэзону, увесь дагавор пусты гук, помпа, урачыстае абяцаньне.

На распрацоўках чакаюць пакуль прыедзе культпрацаўнік і «разгорне культработу». Дырэктар торфазаводу, калі гутарыў з намі аб сацспаборніцтве і ўдарніцтве, не без некаторай крыўды ў голасе заяўляў:

— Рабачком ні ў вус, ніводнага дагавору, разумееш, спаборніцтва і ў спаміне няма... Безобразие...

І гаворана гэта было так, нібы ён, дырэктар, ня мае непасрэднага дачыненьня да гэтага «безобразия».

Новы старшыня рабачкому (ён-жа культпрацаўнік) прыехаў 2 дні таму назад. Не пасьпеў аб'езьдзіць торфараспрацоўкі, не пасьпеў падумаць з чаго тут пачаць, як атрымлівае ад дырэктара камандыроўку на гаспадарчых справах.

Калі культработнік вернецца з камандыроўкі, ён знойдзе той-жа ганебны надпіс крэйдай, які зроблен на дошцы пасёлку № 3.

— Замест культработы сёньня танцулька да ўпаду і моцныя напіткі.

Хто гэта надпіс зрабіў, невядома. У ёй тонкае і праўдзівае зьдзекваньне над пастановкай ўсёй культработы сярод тарфянікаў заводу. У гэтым надпісе абвінавачы акт кіраўніцтву заводу.

Рабачкому фактычна няма. Замест яго—папка з членскімі білетамі, і то членскіх білетаў на ўсіх тарфянікаў толькі палова. Астатнія не ўцягнуты ў саюз.

— Расьпіскі, рахункі і авансавыя справаздачы—вось што я атрымаў ад старшыні рабачкому—апавядаў новы старшыня.

Можна яму даць веры. Большага тут рабачком не зрабіў.

— Партыйная ячэйка?

— Яна яшчэ не раскачалася—сказаў адзін з кіраўнікоў заводу. І гэта верна.

— Райком КП(б)Б?

Ён, гаворачы газэтнай мовай, не стаў тварам да торфазаводу.

— Раённая газэта «Шлях калектывізацыі»?

Яна яшчэ ня была на торфазаводзе. Змрокам мы вярнуліся ў пасёлак.

Ня скончаныя баракі з аголенай грудной клеткай недабудаваных крокваў, сіратліва тырчаць у небе. Няма каму скончыць пабудову. Не хапае будаўнікоў. Хутка будуць пушчаны яшчэ 4 машыны, прыбудзе новая рабочая сіла, а куды яе зьмясьціць? Ды як пакласьці чаш рабочых, ня даўшы ім інтэрнату. На ўсіх пасёлках стаяць няскончаныя баракі. Затое ў цэнтральным пасёлку узьведзена трыбуна для нейкіх вялікіх будучых мітынгаў. Затое над гатавальнікамі, якія яшчэ не працуюць па будаваны прыгожыя будкі, падобныя да ларкоў Массельпрому.

— Якое будаўніцтва вы лічыце ўдарным?

На гэтае пытаньне ня могуць адказаць на заводзе, будуючыся бяз пляну, без чарговасьці...

Не будоўля, а буза.

* * *

На адлегласьці 3-х кілёмэтраў ад масыву «Студзёнка» раскінута вёска тэй жа назвы. 200 тарфянікаў з году ў год ішлі з гэтай вёскі ў балота на распрацоўкі. Ішлі за многа вёрст ад сваёй вёскі, таму, што «Чырвоны Сьцяг» пускаецца толькі ў гэтым годзе. А ў гэтым сэзоне, а цяпер ніводзін тарфянік не працуе на Студзёнскім масыве.

— Чаму?

Гэта пытаньне міжвольна ўзьнікае тады, калі новы завод задыхаецца ад недахопу кваліфікаваных тарфянікаў.

— Ня хочуць—адказваюць тыя, хто фактычна ня хоча і ня можа прыцягнуць гэтую вольную рабочую сілу.

Самі тарфянікі гавораць:

— Мы Лойка не даем веры (Лойка—дырэктар заводу). Наабяцае багата, а на справе маніць... Вам, гаворыць і харч і заработак у мяне будуць на вялікі палец... Ашукаў нас раз і ні ў жысьць зараз не паеду...

Вярней за ўсё вярбоўшчыкі залучаць ня ўмеюць. Часта вярбоўшчыкі заводу прыяжджаюць у вёску, таўкуцца там па некалькі сутак і зварочваюцца на завод з лямантам.

— Ня хочуць ісьці. Вось вам грошы—аванс, няма рабочых.

Ня ўмеюць вярбоўшчыкі, ня ўмее рабачком, ня ўмеюць партыйныя і грамадзкія арганізацыі раёну як сьлед вербаваць рабочую сілу.

— Лепш не абяцалі-б, залатых гор, а сказалі-б як будзем працаваць на справе, тады пайшлі-б.

Так гавораць тыя, каго трэба вербаваць.

— Мы плацім лепш чымся Жэлезком, Лартранс

Такія аргумэнты прыводзяць вярбоўшчыкі, а на справе... а на справе інтэрнаты не дабудаваны, гатуюць вельмі дрэнна, няма гарачай вады, няма абяцаных спэцвопраткі.

Лойка абяцаў тарфянікам зьмяніць нары на ложкі.

— Заўтра зьмяняю.

Пасьля гэтага «заўтра» прайшоў тыдзень, а ложкаў няма і дагэтуль. Няма, і тарфяніцы не патрабуюць, а проста гавораць..

— Зразумела, да будучага [illegible] ложкі будуць.

І тут буза...

Б. Брадоцкі.

Жакты, прыбярэце бурд!

Шмат гавораць цяпер аб барацьбе з антысанітарным становішчам дваро жактаў, але «воз и ныне там...»

Санітарны нагляд разам з брыгадай сэкцыі Аховы Здароўя Гарсавету прад прыняў рашучую барацьбу з бязьдзейнасьцю жактаў. Дасьледваны жакты № 5 і № 7 і складзен рад актаў аб іх антысанітарным становішчы. Аднак, жакты плацяць штрафы, але бруду ня вывозяць. Неабходна, каб у разгорнутай барацьбе за аздараўленьне двароў і жыльля Гаржыльсаюз прыняў належны ўдзел. Ён павінен дапамагчы жактам убраць бруд, прадаставіўшы ім транспарт. Гаржыльсаюз павінен уключыць у барацьбу і асэнізацыйны абоз, які да гэтага часу не разгарнуўся ў дастатковай ступені (38 бочак на ўвесь горад).

Горад павінен быць прыведзен у належнае санітарнае становішча. Усе органы, якім належыць гэта ведыць, павінны памятаць, што справа ідзе аб здароўі працоўных. Адзін сакнагляд без дапамогі адпаведных арганізацый і пралетарскай грамадзкасьці з гэтым ня справіцца.

І так: дайце асабоз і транспарт, каб, нарэшце, ліквідаваць антысанітарнае становішча гораду.

Брыгада сэкцыі Аховы Здароўя Гарсавету: Грыб, Гуртаўнін, Санурач Рохліна.

Максымальна ўшчыльняючы тэрміны сяўбы,

рыхтавацца да ўборачнай кампаніі

Рабочы плян уборкі—кожнаму саўгасу, калгасу, кожнай брыгадзе. Прывесьці ў баявую гатоўнасьць уборачныя машыны

Неадкладна прасунуць уборачныя машыны ў саўгасы і калгасы

Праз 2—3 дэкады ў БССР пачынаецца ўборачная кампанія ў прыватнасьці ўборка сена і канюшыны. Трэба ўжо па ўдарнаму рыхтавацца да ўборкі ўраджаю. Аднак, рад раёнаў да апошняга часу ня адводзяць належнай увагі гэтаму пытаньню. Ня гледзячы на значнае недавыкананьне пляну па завозу ўборачных машын і гэта абмежаваная колькасьць машын застаецца ляжаць на складах. З адпушчаных 2.515 сенакасілак завезена толькі 954, а рэалізавана—506, ці 53 проц. Конных граблеў адпушчана 3.787, завезена 960, рэалізавана 584, ці 61 проц. Такое-ж становішча мы маем і са жняяркамі, якіх пакуль што рэалізавана 58 проц.

Рад раёнаў праяўляе злачынную нядбайнасьць у адносінах да разьмеркаваньня ўборачных машын па калгасах. Ня гледзячы на тое, што плян па адгрузцы кос затрымліваецца, (замест 210 тысяч штук адгружана толькі 35.000, ці 17 проц. патрэбы),—некаторыя раёны зусім не цікавяцца тым, каб прасунуць сенакасілкі ў калгасы. У Баб руйскім раёне з 46 сенакасілак рэалізавана 20, з 73 жняярак рэалізавана 8, з 43 конных граблеў разьмеркавана 21. У Барысаўскім раёне ляжаць на складах усе завезеныя 58 конных граблеў; з 58 жняярак разьмеркавана толькі 8. У Любаньскім раёне ляжаць неразьмеркаванымі 23 жняяркі і 21 сенакасілка; у Чэрвеньскім раёне не разьмеркаваны 24 конных граблеў, 19 жняярак і 16 сенакасілак.

Прыведзеныя факты сыгналізуюць аб тым, што раёны праяўляюць злачынна - нядбайныя адносіны да пытаньня рэалізацыі ўборачных машын. Райкалгассаюзы ня прымаюць належных захадаў каб сваячасова прасунуць машыны ў калгасы. Нічога ня робіцца каб разгарнуць сярод калгасьнікаў шырокую кампанію за мабілізацыю ўнутраных сродкаў. Недапушчальным зьяўляецца такое становішча калі пры існаваньні ільготных умоў для атрыманьня ў крэдыт уборачных машын, месцы не праяўляюць уласнай ініцыятывы каб паставіць па баявыя тэмпы прасоўваньне ўборачных машын у калгасы і саўгасы.

Некаторыя раёны ўсьвядомілі гэту задачу і добра справіліся з задачай разьмеркаваньня ўборачных машын. У Крупскім, Бешанковіцкім і Хоцімскім раёнах усе завезеныя ўборачныя машыны поўнасьцю рэалізаваны.

Сёлета трэба зьвярнуць вялікую ўвагу на мэханізаваную ўборку сена. Трэба зараз-жа правесьці разьмеркаваньне сенакасілак і конных граблеў. Адначасова з гэтым неабходна зараз-жа правесьці, дзе гэта ня зроблена, павярховую ачыстку сенажацяў: зрэзаць куп'ё, кустаўё і г. д. Правядзеньне гэтага мерапрыемства дасьць магчымасьць праводзіць касьбу сенакасілкамі, што ў значнай ступені скароціць тэрміны ўборкі.

Пытаньню рэалізацыі ўборачных машын трэба надаць сур'ёзную ўвагу, трэба дабіцца каб у бліжэйшыя дні ўся наяўнасьць уборачных машын была разьмеркавана па калгасах і саўгасах.



Пабудова сьвірну.

ТЭЛЕГРАМА ЦК КП(б)Б і СНК

сакратарам райкомаў, старшыням райвыканкомаў

Арганізуйце масавы кантроль выкананьня пасеўныя плянаў калгасамі і аднаасобнікамі. ПРАВЕРКУ ПАЧАЦЬ БЕЗАДКЛАДНА І СКОНЧЫЦЬ 9 ЧЭРВЕНЯ. Вынікі праверкі ўключыць у зводку на 10. Задачай праверкі паставіць ліквідацыю недасеву.

Прымеце рашучыя меры да кулацка-заможных гаспадарак, якія зрываюць сяўбу і прыцягваць апошніх да суровай адказнасьці.

Сакратар ЦК ГЕЙ.
Старшыня СНК ГАЛАДЗЕД.

Вафронту пасеўнай

БАБРУЙСК 2-VI (БЕЛТА). Калгасы «Віктароўка», «1 мая», «імя калгаснага Зьезду», імя Калініна, «Ударнік», «Пчолка», «Новае Жыцьцё», «Мэр куры», «Чырвоны Партызан», «Камуна», імя Вароўскага, перавыканалі плян сяўбы тэхнічных культур. Сяўбу скончылі да 1-га чэрвеня. Калгас «1 мая» перавыканаў плян на 250 проц.

У астатніх-жа калгасах раёну сяўба ідзе зусім нездавальняюча. На 1-е чэрвеня пасеўны плян ідзе астатнімі калгасамі выкананы толькі на 30 проц.

Калгас «Камбайн», Слуцкага раёну поўнасьцю скончыў сяўбу. Працавалі ўдарнымі брыгадамі. Між брыгадамі было арганізавана сацспаборніцтва. Камбайнаўцы ўзялі на буксір калгас «1 мая».

28 мая яны з сваімі коньмі выехалі на дапамогу калгасу «1 мая» і пасадзілі 13 га бульбы.

Р. Некрашэвіч.

Калгасьнікі Склінінскага сельсавету, Клімаўскага раёну, у адзнаку пасьпяховага скончэньня веснавой пасеўкампаніі арганізавалі чырвоны абоз. Абоз эдаў 400 пуд. збожжа.

Калгасьнікі выклікаюць на сацспаборніцтва—у арганізацыі чырвонага абозу—Раднянскі, Мілаславіцкі, Кісяле ва-Будзянскі і Гусарскі сельсаветы.

Пракоф'еў.

Калектывізацыя па Багушэўскім сельсавеце Багушэўскага раёну праходзіць вельмі марудныя тэмпамі. Сельсавет і мясцовая арганізацыя спадзяюцца на самацёк. Гэтым карыстаюцца кулакі і падкулачнікі, якія актыўна агітуюць супроць калгасаў.

Наогул сельсавет вельмі прымірэнча адносіцца да кулацтва. Цьвёрдыя заданьні па сяўбе і загатоўках кулакамі ня выконваюцца. У в. Худаелі ў калгас пралезьлі кулакі і папоўскія сыны, якія толькі шкодзяць рабоце калгасу. Калгас у в. Дабрынёва не наладзіў нармальных узаемаадносін з аднаасобнікамі.

Усё гэта вельмі дрэнна адбіваецца на далейшым пашырэньні калектывізацыі і пасьпяховым канчэньні веснавой сяўбы.

Брыгада **«Сав. Бел.» О. Ст. і Я. С.**

Мсьціслаўль. Калгасы Мазалаўскага сельсавету пасьпяхова праводзяць веснавую пасеўкампанію. Некаторыя ярына ўжо узыйшла, прычым усходы вельмі добрыя.

Аднаасобны сэктар значна адстае ад калгаснага. Аднаасобны сэктар ўзараў усяго 30 проц. яравога кліну, засеяўшы 12 проц. плянавага заданьня.

У сувязі з тым, што зараз цягавая сіла ўжо значна падкармліваецца на полі, тэмпы ворыва і сяўбы ўзрастаюцца.

Ячэйкай КП(б)Б і сельсаветам прыняты меры да засеву бросавай зямлі, якой налічваецца каля 150 га. Насеньне на гэту зямлю адпускае земчастка РВК; ворыва праводзіць машына-трактарны атрад, а сяўбу праводзяць суседнія калгасы. Такім чынам, бросавая зямля ў сельсавеце будзе засеяна.

Я. М.

Калі калгасы Хойніцкага раёну пасьпяхова заканчваюць веснавую сяўбу, дык аднаасобны сэктар значна адстае. Гэта відаць з таго, што ў в. Мокіш 87 аднаасобнікаў засеялі толькі 50 га розных культур. Кулацка-заможныя гаспадаркі, якім даны цьвёрдыя заданьні па сяўбе, яны зусім не жадаюць выконваць гэтых заданьняў.

П. Л.

Да ўборачнай кампаніі ня рыхтуюцца

У Віцебскім раёне пытаньне пра ўборачную кампанію яшчэ ня стала ў цэнтр увагі раённых арганізацый. Земчастка РВК. Гарсавет, Райкалгассаюз і Райкаапсаюз у падрыхтоўцы да ўборачнай кампаніі амаль зусім нічога не зрабілі. Ні адна з гэтых устаноў нават не абгаварыла гэтае пытаньне. Плянаў уборачнай кампаніі ня складзена, ніякіх указаньняў мясцом ня дадзена.

Загадчык сельска-гаспадарчага аддзелу Гарсавету тав. Залеская на запытаньне брыгады «Савецкай Беларусі» аб тым, чаму да гэтага часу не распачата падрыхтоўка да ўборачнай кампаніі, адказала: «Зараз мы заняты іншымі пытаньнямі, веснавой сяўбой і калектывізацыяй».

Такі-жа адказ атрымала брыгада ад кіраўнікоў Райкалгассаюзу і Райкаапсаюзу.

Работа па правядзеньні калектывізацыі і веснавой сяўбы, ні ў якім разе ня павінна зьвяліцца перашкодай да ўборачнай і асеньняй пасеўкампаніі.

Неабходна зараз-жа зрабіць рашучы пералом у падрыхтоўцы да ўборачнай кампаніі. Вінаватых у невыкананьні пастаноў партыі і ўраду трэба прыцягнуць да адказнасьці.

С. Міркін.

Барысаўшчына не пераключылася да ўборачнай

Барысаў (наш кар.). У мінулым годзе ў Барысаўскім раёне, дзякуючы несваячасовай падрыхтоўцы да ўборачнай кампаніі, дрэнная пастаноўцы сіл, адсутнічаньню зьдзельнай аплаты—шмат сена, бульбы, збожжа засталася неўбраным на калгасных палёх.

Аднак гэтыя вурокі кіруючымі раённымі арганізацыямі—райземчасткай і райкалгассаюзам у гэтым годзе ня ўлічаны. Падрыхтоўкай да ўборачнай яны зусім не займаюцца — спадзяюцца на самацёк.

Да гэтага часу ня складзены плян уборачнай кампаніі. Сельсаветам і калгасам ня дадзена ніякіх паказаньняў, зусім марудна ідзе прасоўваньне ў калгасы ўборачных машын.

Бакол падрыхтоўкі да ўборкі не разгорнута ніякай арганізацыйна-масавай работы. У сельсаветах і калгасах не прапрацаваны пастановы Калгасцэнтру аб падрыхтоўцы і правядзеньні ўборачнай кампаніі.

У гэтым годзе Барысаўскі раён павінен засілосаваць па пляну 18.560 тон зялёнай масы. Але, у большасьці калгасаў і сельсаветаў яшчэ не распачата падрыхтоўка сілосных ям і траншэй.

У шмат якіх сельсаветах і калгасах існуюць такія, апартуністычныя разважаньні: **«дайце нам скончыць з сяўбой, тады возьмемся за ўборку».**

Падрыхтоўку да ўборачнай трэба зараз-жа ўвязаць з конкурсам на лепшае правядзеньне веснавой сяўбы.

Толькі той калгас, саўгас, сельсавет атрымае пяршынства ў конкурсе, які, адначасна з пасьпяховым скончэньнем сяўбы, найлепш падрыхтуецца да ўборкі.

Неабходна зараз-жа вызначыць нормы выпрацоўкі ўборачных работ, з тым, каб на аснове зьдзельшчыны і разгортваньня сацспаборніцтва і ўдарніцтва па бальшавіцку правесьці ўборачную кампанію.

С.

КАРМЫ—АСНОВА ЖЫВЕЛАГАДОЎЛІ

Засеў кармавых, падрыхтоўку да сілоснай кампаніі, сенаўборку—пад штодзённы кантроль!

Як арганізаваць пашу для сьвіней

Сьвінасаўгасы і калгасы павінны адыграць вялікае значэньне ў вырашэньні мясной праблемы. Саўгасы «Сьвінаводу» павінны сёлета ўжо здаць дзяржаве 40950 сьвіней, што зьяўляецца вялікім дасягненьнем.

У сувязі з шырокім размахам сьвінагадоўлі вялікае значэньне набывае правільны дагляд і кармленьне сьвінога стада. У летні перыяд асабліва важным пытаньнем зьяўляецца правільная арганізацыя пашы.

Утрыманьне сьвіней на пашы зьберагае ад 50 да 70 проц. моцных кормоў; апроч таго, на пашы як дарослыя сьвіньні так і парасяты становяцца больш моцнымі і здаровымі. Вось чаму для сьвіней павінна быць арганізавана паша ва ўсіх саўгасах і калгасах, выходзячы з разьліку 1 га пашы на 6—12 матак з парасятамі ці 12 матак паросных, ці 25—30 6-цімесячных падсьвінкаў.

Сёлета ў нас няма яшчэ выганаў шматгадовых траў, таму зараз патрэбна арганізаваць пасевы аднагадовых расьлін і скарыстаць часткова на пашу канюшыну і азімае жыта з вікай. Азімае жыта з вікай даюць самы ранні корм, але гэтых пасеваў у нас вельмі мала. Таму самай раньняй пашай павінны зьявіцца сухадольныя сенажаці, лясныя паляны, хмызьнякі і верасьнякі. Пры адводзе пад пашу сухадольных сенажацяй і старых канюшынішчаў неабходна правесьці палепшаньне іх, шляхам унясеньня гнёвай жыжы (ад 50 да 100 бочак на га) ці перапрэўшага гною (ад 50 да 100 вазоў), ці пры адсутнасьці паказанага ўнясеньня можна ўжываць сярчана-кіслы амоні і суперфасфат (першага 1,5 цнт., а другога 2-3 цнт. на га). Калійнае ўгнаеньне вельмі неабходна для палепшаньня лугоў; у зьвязку з недахопам калійнага ўгнаеньня яго можна замяніць попелам (4—7 цнт. на га).

На зьмену паказаным раньнім пашам трэба закласьці пашы з яравых пасеваў, а менавіта: віка—аўсяная мешанка (120 кг. вікі+60 кг. аўса высева на га), з такой-жа мешанкай пялюшкі ці гароху з аўсом, з аднаго аўса ці ячменю (высеў 180 кг. на га). Мешанка кукурузы з гарохам або вікай (60 кг. кукурузы і 60 кг. вікі ці гароху) даюць добрую пашу. На лёгкіх глебах (пяскох і супесях) на поўдні БССР вельмі добра арганізаваць пашу з могара і проса (высеў 30 кг.). Сэрадэля як самастойны раньні веснавы пасеў, так і падсеў пад жыта (гушчыня высеву 60 кг. на га). Падсеў у міжрадкоўі жыта радковымі сяўнікамі, морквы 5—7 кг. на га дае ў канцы верасьня і кастрычніка вельмі добрую пашу як націньнем, так і каранямі.

Сёлета кожны калгас і саўгас павінны закласьці пашу для сьвіней ня толькі для карыстаньня ў бягучым годзе, але і для мэтаў карыстаньня і ў наступным годзе са шматгадовых расьлін: люцэрны, канюшыны, мешанак канюшыны, тапінамбура і інш.

У кожным пасяўным кліне севазвароту трэба разводзіць 3-4 з вышэйпаказаных расьлін, якія забясьпечваюць сьвіное стада бесьперапыннай пашай. Напрыклад—рана ўвесну паша (красавік—май) 1) на лугох; віка і віка—жытняя мешанка, 2) у чэрвені—па віка—аўсянай мешанцы, 3) у ліпені і жніўні—гарохава-кукурузная і аўсяна-вікавая мешанкі, 4) у верасьні і кастрычніку—сэрадэля, морква падсеўная. Арганізацыя пашы павінна заняць такую плошчу, якая-б дазволіла па меры страўліваньня аднаго вучастку адводзіць другі, калі расьліны на ім добра вырастуць. Страўлены вучастак пашы, калі яна ня можа даць атаву, неабходна зараз-жа перааараць і засеяць.

Трэба сачыць за тым, каб сьвіньні ня рылі пашу. Для гэтай мэты сьвіней пасуць толькі да таго часу, пакуль яны не пачнуць рыць, а яны пачынаюць рыць, калі пад'ядуць. Сьвіней трэба пасьвіць па 2 гадзіны ранцою і па 2 гадзіны пад вечар; пасьля гэтага іх заганяюць пад паветку, якая звычайна будуецца сярод пашы. Заўважна, што сьвіньні, якія атрымліваюць мінэральны корм (мешаніны—40 проц. мелу ці гашанай вапны, 40 проц. касьцяной мукі ці драўнянага попелу і 20 проц. солі) ня рыюць пашы.

На далёкай пашы ад сьвінарнікаў будуюць паветку для захоўваньня сьвіней ад гарачыні і вялікіх дажджоў. Маткам з парасятамі будуюцца з дошак перасоўныя домікі. Завадзкіх матак з парасятамі лепш пасьвіць на аднагадовай пашы, якую хоць і парыюць, дык гэта асаблівага значэньня ня мае, за тое на іх можна трымаць матак і парасят амаль што ўвесь час, што вельмі спрыяе лепшаму разьвіцьцю і здароўю сьвіней.

У час дзеннай гарачыні і вялікіх дажджоў сьвіней трэба трымаць пад паветкай, або ў перасоўных домках. У гэты час неабходна падкормліваць сьвіней сьвежым нязьлежаным зялёным кормам.

На пашы сьвіньні павінны падкормліваца канцэнтраванымі кармамі. Іх даюць ад 25 да 50 проц. ад агульнай патрэбы ў корме ў залежнасьці ад якасьці пашы, ад узросту і прадукцыйнасьці сьвіней.

Сьвіней трэба паіць на пашы. Карыта са сьвежай вадой ці аўтаматычныя паілкі паённы заўсёды стаяць на пашы, а таксама ў палявых загонах і паветках.

Арганізацыя пашы для сьвіней неабходна пачаць з гэтага году з тым, каб у наступным годзе сьвіньні былі поўнасьцю задаволены пашай.

Шкодніцтва ці галавацяпства?

У саўгасе імя Лекерта, у сілосе зной дзена шмат розных жалезных рэчаў (цьвікоў, кавалкаў дроту, костак, бітага шкла і інш.), у выніку чаго некалькі кароў, праглынуўшых гэтыя прадметы, адасланы на бойню, дзе пры ўскрыцьці і былі знойдзены гэтыя рэчы.

Адміністрацыя саўгасу ў асобе Сіповіча і Мяца не магла ня бачыць гэтага пры закладваньні сіласнай масы, бо такой шкодніцкай зброі цяпер у сілосе можна сабраць не адзін цэнтнэр.

Другі факт: калі рэзалі салому на сечку для корму жывёле, дык пад нож сячкарні трапляў і дрот з цюкоў саломы. Саўгас атрымліваў прасованую салому і дрот адразу ня здымалі. Ён цягаўся па саўгасе ўсюды і Сіповіч з Мяцам блыталіся нагамі ў гэтым дроце, але не загадалі сабраць яго. Неаднаразова рабочыя заяўлялі ім, каб салому расьцюкаваць адразу, але яны бязьдзейнічалі. Мяц ня раз бачыў як вылятае агонь іскрамі з сячкарні, але ён лічыў лепшым бадзяцца без работы па дачах саўгасу, чым глядзець за сваімі справамі.

Ініцыятыва і творчасьць рабочых за цураецца адміністрацыяй. Аб самакрытыцы рабочыя і думаць баяцца. Адміністрацыя замазвае вочы капеечнымі пытаньнямі, а тысячарублёвыя недахопы, у якіх вінна адміністрацыя, не выкрываюцца. Адміністрацыя ўмела адхіляе ўдар рабочых. Напрыклад: гэтымі днямі рабочая брыгада саўгасу абсьледвала работу аборы і, апроч дробных пытаньняў, накшталт таго, што некаторыя з рабочых аказаліся без фартухоў ці без касынак на галаве, нічога ня выяўлена. Тысячарублёвыя прарывы, якія паходзяць ад адміністрацыі, засталіся ня ўскрытымі. І ня дзіва, бо ў складзе гэтай брыгады была сама адміністрацыя (Сіповіч), а Мяц загадзя праінструктаваў брыгаду, як і на што трэба зьвярнуць увагу.

Заг. саўгасу т. Бурак прапановы і патрабаваньні рабочых і работнікаў-спэцыялістаў таксама ігнаруе. Палепшаньнем быту рабочых і культурным абслугоўваньнем ён ня цікавіцца. Зарплата рабочым па прычыне таго, што бухгальтар Кавалевіч не спраўляецца з работай выдаецца з вялікім спазьненьнем, у той час, як іншыя саўгасы зарплату атрымліваюць своячасова. Бурак у гэтых адносінах бязьдзейнічае, ён свае адміністрацыйныя правы перадаў бухгальтару Кавалевічу, які лепіч трымае сваю адміністрацыю на павадку, наводзіць на дрэнную думку,—ці ўсё добра ў становішчы каштоўнасьцяй, грошай і ўсёй маемасьці.

Неабходна тэрмінова правесьці дакладную ўсебаковую рэвізію: праверыць становішча бухгальтэрыі, дакумантаў і правільнасьць і своячасовасьць правядзеньня вучоту аб'ектаў гаспадаркі на кнігах.

Умоў для плённай работы ў саўгасе Лекерта няма і з гэтай прычыны некаторыя з работнікаў падалі заявы аб звальненьні.

Ня так даўно ў газэце «Сав. Бел.» быў зьмешчаны артыкул пра Мяца і Сіповіча, характарызуючы іх як сапраўдных апартуністаў і галавацяпаў. Паказаныя факты шкодніцтва ці разьюшнага галавацяпства гаварыць аб тым, што партыя, пракуратура і рабочая грамадзкасьць павінны даць ім па заслугах.

З.



Цьвікі, дрот, шкло і інш. рэчы траплёўшыя ў сілас. (Саўгас імя Леркерта).

Сьмілаўшчына яшчэ цягнецца ў хвасьце

У Сьмілавіцкім раёне падрыхтоўка да ўборачнай кампаніі яшчэ не пачалася. Паасобныя калгасы ня ўлічваюць памылак уборачнай кампаніі мінулага году. Уборачныя машыны не дагледжаны і не адрамантаваны, месца, куды звозіць ураджай, ня вызначана. Большасьць калгасаў раёну гэтым пытаньнем і па сёньняшні дзень не заняліся. Старшыні калгасаў лічаць уборку другараднай справай, з якой можна пачакаць.

З боку паасобных партыйных, савецкіх і грамадзкіх арганізацый няма рашучага адпору кулаку, які агітуе за зрыў уборачнай кампаніі.

Сельсаветы раёну стаяць у баку ад уборачнай кампаніі кажучы, што гэта «ня наша справа».

Асабліва бязьдзейнічаюць у падрыхтоўцы да ўборкі Пятровіцкі і Карзуноўскі сельсаветы. Яны кажуць: «гэта справа калгасаў, дык яны хай і займаюцца. У нас і сваіх спраў даволі».

Калгасы «16 партызан», «Праца», «Чырвоная Зьмена», «Савецкая Беларусь», «Чырвоны партызан», «Дружба», «Краіна Саветаў», «Зьвязда», «Дзяржынскага», «Чырвоны Прафінтэрн» і «Х Зьезду ЛКСМБ»—зусім не гатовы да ўборкі і аб гэтай справе ня думаюць. Шмат у якіх калгасах няма дзе палажыць ураджай.

Райкалгассаюз, а таксама РВК узялі стаўку на самацёк. Жораўская, Сьмілавіцкая, Старынская, Маторауская, Рудзенская і інш. ячэйкі КСМ гэтага пытаньня не разглядалі. Нават партыйная ячэйка саўгасу Дукора абмінула гэтае пытаньне. Сакратар-жа яе Шычко Арцём кажа:—ні ячэйкі справа займацца ўборачнай.

Уборачная кампанія павінна зьвяліца галоўнай штодзённай тэмай партыйных, камсамольскіх і савецкіх арганізацый. Уборку патрэбна правесьці ўдарна, каб нанесьці канчатковы ўдар кулаку.

К. В.

Да рамонту ўборачнага інвэнтару і машын яшчэ не прыступілі

Ворша (наш кар.). У галіне падрыхтоўкі да ўборачнай кампаніі ў Аршанскім раёне нічога ня зроблена. Райза толькі зараз пачаў складаць плян уборачнай кампаніі. Райкалгассаюз-жа і райкаапсаюз нават яшчэ і плянаў не складалі.

Да рамонту ўборачнага інвэнтару ў раёне яшчэ ня прыступлена. Райкаапсаюз не падрыхтаваў свае склады для прыёму ўборачных машын. Склады загружаны насеньнем, угнаеньнем і машынамі па вырабу глебы.

Райком партыі і райвыканком павінны зараз-жа спыніць гэтую марудназьць.

Падрыхтоўцы да ўборачнай трэба надаць бальшавіцкія тэмпы.

А. Кудрын.

Сяўба пад пагрозай зрыву

Аднаасобны сэктар выканаў плян толькі на 16,3 проц.

Клімавічы. Тэрмін сяўбы скончыўся, аднак на 25-V агульнае выкананьне пляну па Клімаўшчыне складае 17 пр. Самы высокі проц. мы маем па збожжавых культурах (30 проц.). Але і гэты процант зьяўляецца паказьнікам апартуністычных тэмпаў сяўбы.

Па астатніх культурах паказьнікі выкананьня пасеўнага пляну яшчэ горшыя. Тэхнічныя культуры—лён і канопель—засеяна 3 проц. пляну, бульбы—12 проц., каранеплодаў 2 проц. сілосных культур—0,2 проц., траў—8 проц., гародніны—3 проц. Агульны процант выкананьня пасеўнага пляну па саўгасах складае 32,7 проц., па калгасах 15,6 проц. і па аднаасобных гаспадарках—16,3 проц. Як відаць, сяўба травяных і сілосных культур па раёне злачынна сарвана.

Абвешчаны раённы камітэт партыі і РВК конкурс на лепшае правядзеньне сяўбы на ўсюды даведзен да шырокіх мас калгасьнікаў і бядняцка-серадняцкіх мас аднаасобнікаў. Ёсьць выпадкі, дзе гэты конкурс партячэйкі і сельсаветы праспалі (Хатовіж). На запытаньне прадстаўніка РК, якая работа праведзена для папулярызацыі конкурсу—сакратар партячэйкі т. Сілкін (Хатовіж), разводчыкі рукамі заявіў: «пра конкурс я нічога ня чуў».

«Ня чуў» пра конкурс Хатовіжскі сельсавет і праўленьні 4 калгасаў на тэрыторыі гэтага сельсавету.

Сацспаборніцтва паміж калгасамі і ўдарніцтва ўнутры калгасаў не разгорнута. Зьдзельшчына ў калгасах праведзена фармальна, бюрократычна. Вучоту няма.

В. Бальзоўскі.

Усебеларускі рэйд ударных брыгад „Савецкая Беларусь“ „За Коммунистическое Просвещение“ і ЦП працасьветы

Плян школьнага будаўніцтва ПАВІНЕН БЫЦЬ ВЫКАНАНЫ

Бесьперабойна забясьпечваць матар'ялямі, шырока скарыстаць мясцовыя рэсурсы, узняць працоўныя масы на дапамогу школьнаму будаўніцтву

Бязьлітасна біць па апартуністычнай недаацэнцы ўсеагульнага навучаньня

За баявыя тэмпы ў школьным будаўніцтве

Матар'ял брыгады рэйду і допісы з месц сьведчаць аб тым, што выкананьню пляну школьнага будаўніцтва пагражае зрыў, калі ня будзе зараз-жа мабілізавана ўся грамадзкасьць, калі рай выканкомы і сельсаветы не павернуцца па сапраўднаму тварам да школьнага будаўніцтва.

Ударныя брыгады ўсебеларускага рэйду газэт «Савецкая Беларусь», «ЗКП» і ЦП працасьветы павінны па баявому змагацца за выкананьне пляну школьнага будаўніцтва. Яны павінны праверыць становішча з будаўніцтвам на месцах і высунуць свае прапановы мясцовым арганізацыям для ліквідацыі прарываў на гэтым фронце і дабівацца ажыцьцяўленьня сваіх прапаноў.

Ударныя брыгады рэйду павінны разгарнуць шырокую растлумачальную работу сярод калгасьнікаў, беднякоў і сераднякоў, каб уцягнуць іх у актыўную дапамогу выкананьню пляну школьнага будаўніцтва, шляхам падвозкі матар'ялаў, прадастаўленьня рабочай сілы, мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў па будаўнічых матар'ялах.

Зьмяшчаемая сёньня пастанова Калегіі Наркамасьветы ўскладае адказнейшую задачу на ўсе культасьветныя ўстановы БССР. Яны павінны разам з ударнымі брыгадамі ўсебеларускага рэйду змагацца за выкананьне пляну культурнага будаўніцтва, у тым ліку і школьнага будаўніцтва.

Кожны ўдзельнік культэстафэты—ударнік культурнага фронту, змагаючыся за ажыцьцяўленьне задач апошняй, павінен абвясьціць сябе ўдарнікам друку і, арганізаваўшыся ў брыгады, з яшчэ большай напружанасьцю замагацца за выкананьне пляну культурнага будаўніцтва трэцяга рашаючага году пяцігодкі.

Адзіным фронтам у паход за выкананьне культпляну

Пастанова Калегіі Народнага Камісарыяту Асьветы

У мэтах мабілізацыі ўсяе пралетарскай грамадзкасьці для пасьпяховага заканчэньня навучальнага году і своячасовага правядзеньня падрыхтоўкі да новага навучальнага году,—Калегія НКАсьветы пастанаўляе:

1. У дапамогу рэйду «ЗКП» і «Савецкай Беларусі» вылучыць т.т. Брыгневіча, Гальбрайха, Рамановіча, Арлоўскага і Якубчыка.

2. Зьвярнуць увагу ўсіх штабаў Культэстафэты II-га этапу, раённых і гарадзкіх саветаў на неабходнасьць, разам з правядзеньнем Культэстафэты, як асноўнага мэтаду разгортваньня культмасавай работы,—уключыць у ўсім культэстафэтным установам у рэйд брыгад «ЗКП» і «Савецкая Беларусь» і ЦП Працасьветы.

3. Раіць усім раённым штабам у бліжэйшы час склікаць шырокі зьлёт культармеі гораду і раёну з удзелам культармейцаў—рабочых, калгасьнікаў, асьветнікаў—для падвядзеньня вынікаў навучальнага году, асаблівую ўвагу зьвярнуўшы на наступныя пытаньні:

а) на падрыхтоўку і поўнае абслугоўваньне культпалітработай уборачнай і пасеўнай кампаніі; выкананьне прамфінпляну і абслугоўваньне сэзоньнікаў;

б) на школьнае будаўніцтва; матар'яльнае забясьпечаньне ўсіх культ палітустаноў да новага навучальнага году; падвышэньне палітычнай і па літэхнічнай кваліфікацыі настаўніцтва;

в) на барацьбу за адзіны культплян работы ў гарадох, раёнах прад прыемствах, калгасах і г. д.;

г) на разгортваньне сеці курсаў для падрыхтоўкі рабочай, батрацкай і калгаснай моладзі ў тэхнікумы і ФЗВ;

д) на разгортваньне мерапрыемстваў за суцэльную пісьменнасьць у БССР.

4. Даручыць Штабу Культэстафэты ў 2-х дзённы тэрмін, разам з кіраўніцтвам Рэйду, праз друк, даць практычныя паказаньні аб парадку ўключэньня Рэйду ў Культэстафэту II-га этапу.

5. Асаблівая ўвага павінна быць зьвернута ў часе правядзеньня Рэйду на праверку выкананьня пастаноў ЦК КП(б)Б і НКА ў галіне культурнага абслугоўваньня нацменшасьцяй БССР.

Старшыня Калегіі Наркамасьветы ПЛАТУН.

Будуюць з 1929 году, а лес яшчэ не акораны

Яшчэ з зімы 1929 году ў в. Яськаўшчыне, Жданавіцкага сельсавету, пачалі будаваць плянавую школу. Тады-ж сяляне вывезьлі амаль што ўвесь лес пад школу, але гэты лес да мая г. г. валяўся параскіданым па полі. Частка лесу і да гэтуль не акорана.

Зараз наша вёска адышла да Дрыбінскага раёну, але справа з будаўніцтвам школы наперад ня рухаецца.

Райвыканком павінен прыняць захады, каб школа была пабудавана.

М—к.

Школьнае будаўніцтва на апошнім месцы

ВОРША. (Наш кар.). Паводле пляну школьнага будаўніцтва на Аршаншчыне не вызначана пабудаваць двухкамплектныя школы: у в. Селекта Шапкаўскага сельсавету, у в. Бранцава Межаўскага сельсавету і ў в. Шэмбэра, Бараньскага сельсавету; чатырохкамплектную школу ў в. Пугляі і сямігодку ў Барані. Гэта новае будаўніцтва абыйдзецца звыш 50.000 руб. А звыш гэтага будуць яшчэ заканчвацца пабудовай Бараньская, Зубраўская і інш. пачатковыя школы.

З падрыхтоўкай-жа да будаўніцтва справа стаіць вельмі дрэнна. Райвыканком ніяк не зьбярэцца заключыць умовы з будканторай на здачу апошняй школьнага будаўніцтва па раёне. Будкантора не чакаючы пакуль да яе прыдуць (а гэта павінна было быць у некалькі разоў ужо прасіла Райвыканком заключыць умову, але апошні маўчыць, нібы яго няма.

Ня лепш думаюць аб школах і клапоцяцца аб іх пабудове сельсаветы і само настаўніцтва. Там, дзе настаўнікі арганізавалі сялянства на вывазку лесаматар'ялу для школ, як напрыклад у в. Бранцава, там лес на школы вывезены ўжо амаль поўнасьцю. Настаўніца гэтай вёскі т. Гуцько з-агітавала нават і жанчын, якія таксама прынялі ўдзел у вывазцы лесу для школы. Затое настаўнікі Бразьдзечынскага Крапівенскага і Панізоўскага сельсаветаў амаль нічога не зрабілі ў справе пабудовы школы.

Ёсьць нават такія члены сельсавету, якія зрываюць вывазку лесаматар'ялаў, як гэта было ў Межаўскім сельсавеце.

Школьнае будаўніцтва на апошняе месца заганяе і Белдзяржснаб, які да гэтага часу не сабраўся забясьпечыць пабудову школ цьвікамі, цэмэнтам і д. Дзякуючы гэтаму школьнае будаўніцтва па Аршанскім раёне пад пагрозай зрыву.

А. К.

Слуцкі леспрамгас тварам... ад школ

Да будаўніцтва школ Слуцкі раён прыступіў яшчэ месяц таму назад. Усё ішло-б добра, каб ня было перашкод з боку плянуючых арганізацый. Да гэтага часу не адпушчаны будаўнічыя матар'ялы, як цьвікі і піламатар'ял. **Трэба выконваць сталярную работу, але Слуцкі леспрамгас і ня думае аб гэтым, хоць і маецца адпаведная дырэктыва прэзыдыуму РВК.**

Зрыўшчыкаў школьнага будаўніцтва неабходна прыцягнуць да адказнасьці. Адносна іншай працы па падрыхтоўцы да навучальнага году трэба адзначыць, што яна праходзіць большменш добра. РВК выдадзена абавязковая пастанова аб усеагульным навучаньні. Праведзена нарада сельінспэктароў нарасьветы па пытаньнях аб падрыхтоўцы да новага навучальнага году. Зроблены адпаведныя заказы на вопратку і абутак, падручнікі і г. д. Калі будзе ліквідаваны прарыў з будаўнічымі матар'ялямі, дык навучальны год сустрэнем падрыхтаванымі.

К—ка.

АФІЦЫЙНЫ АДДЗЕЛ

Пастанова

Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і Савету Народных Камісараў БССР

пра зьмену п. „л“ арт. 7 палажэньня пра сельскія і местачковыя суды БССР

У адпаведнасьці з пастановаю ЦВК і СНК СССР за 4 сакавіка 1931 г. «Пра зьмену пастановы Прэзыдыуму ЦВК СССР за 29 верасьня 1930 г. пра арганізацыю сельскіх судоў» (З. З. СССР 1931 г., № 15, арт. 145) Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляюць запісаць п. «л» арт. 7 палажэньня пра сельскія і местачковыя суды БССР (З.З. БССР 1931 г., № 4, паст. 31) у наступнай рэдакцыі:

«л) працоўныя спрэчкі на суму ня больш 25 рублёў, якія ўзьнікаюць паміж наймовымі работнікамі і наймальнікамі — працоўнымі (аднаасобнымі працоўнымі сялянскімі гаспадаркамі, саматужнікамі, рамесьнікамі і інш.) а таксама паміж грамадзкімі пастухамі і наймальнікамі.

Працоўныя спрэчкі паміж батракамі і пастухамі з наймальнікамі вырашаюцца сельскімі судамі на падставе асобнага закону».

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР
А. Чарвякоў.

Нам. Старшыні Савету Народных Камісараў БССР
Грысевіч.

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР
М. Гнілякевіч.

25 мая, 1931 г.
гор. Менск.

Пастанова

Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і Савету Народных Камісараў БССР

пра ўмовы працы хатніх работніц (работнікаў)

Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Савет Народных Камісараў БССР **пастанаўляюць:**

1. Даручыць Народнаму Камісарыяту Працы выдаць правілы аб умовах працы хатніх работніц (работнікаў).

2. З выданьнем гэтых правіл лічыць скасаванай пастанову ЦВК і СНК БССР за 14 мая 1927 г. «Аб умовах працы хатніх работніц і работнікаў, якія выконваюць работу асаблівага абслугоўваньня наймальніка і яго сям'і» (З.З. БССР 1927 г., № 25, арт. 117).

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР
А. Чарвякоў.

Нам. Старшыні Савету Народных Камісараў БССР
А. Калнін.

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР
М. Гнілякевіч.

25 мая, 1931 г.
гор. Менск.

Пастанова

Савету Народных Камісараў БССР

пра праверку выкананьня дырэктыў ураду ў дзяржаўных і каапэрацыйных установах

Савет Народных Камісараў БССР **пастанаўляе:**

1. Абавязаць кіраўнікоў цэнтральных устаноў:

а) для сыстэматычнага нагляду і кантролю за выкананьнем дырэктыў Ураду ў кожнай установе спэцыяльна вылучыць члена Калегіі (прэзыдыума альбо кіраўніцтва), як правіла, аслабаніўшы яго ад усякай іншай работы і ўскладаўшы на яго пэрсанальную адказнасьць за своечасовую праверку выкананьня дырэктыў;

б) забясьпечыць выкананьне дырэктыў Ураду абавязковым замацаваньнем адказнасьці выкананьня ў адпаведныя тэрміны за пэўным выканаўцам і складаньнем канкрэтных плянаў выкананьня; увесьці жорсткі кантроль і дысцыпліну ў выкананьне дырэктыў Ураду.

2. Сталы нагляд за пастаноўкай справы кантролю ў цэнтральных установах усклаьці на Народны Камісарыят Рабоча-Сялянскай Інспэкцыі.

3. Прапанаваць кіраўнікам цэнтральных устаноў і арганізацый паведамліць Савету Народных Камісараў і Народнаму Камісарыяту Рабоча-Сялянскай Інспэкцыі прозьвішча асобаадказных за пастаноўку справы кантролю выкананьня.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР
М. Галадзед.

Кіраўнік Спраў Савету Народных Камісараў і Эканомсавету БССР
С. Кандыбовіч.

28 мая, 1930 г.
гор. Менск.

З лістоў рабселькораў

⊙ **Буда-Кашалёўскі нарсуд** ня мае памяшканьня для работы. Канцэлярыя суда ад залі пасяджэньняў знаходзіцца на адлегласьці 6 кілёмэтраў. РВК не клапоціцца аб тым, каб забясьпечыць нарсуд памяшканьнем.

Бойганкаў.

⊙ **Нерэгулярна дастаўляюцца газэты** Камарынскай поштай. Іншы раз газэты і часопісы зусім губляюцца. Гэта адбівае ў падпісчыкаў ахвоту ў далейшым падпісвацца на газэты.

У. К—оў.

⊙ **Нічога ня робіць** Кабыліцкая пажарная дружына, Пухавіцкага раёну. Пажарны інвэнтар неадрамантаваны, нагляду за ўвядзеньнем супрацьпажарных мерапрыемстваў па вёсцы не праводзіцца. Дысцыпліны сярод пажарнікаў няма.

Шэлег.

⊙ **Расьнянская пошта,** Сеньненскага раёну, заўсёды адчыняецца са спазьненьнем—гадзін у 10-11. Працдысцыпліна сярод працаўнікоў пошты кульгае.

Зарніца.

⊙ **Я не атрымаў** і дагэтуль літаратуру па падрыхтоўцы ў ВНУ, выпісаную праз Бел. аддз. Дзяржвыдату, хоць павінен быў атрымаць яшчэ ў сакавіку месяцы. Хто вінаваты ў затрымцы выпісанай літаратуры?

Я. Красько.

Толькі на 41,6 проц. выканан плян

другога кварталу на 1 чэрвеня

Сельсаветы Зажэвіцкі і Мецявіцкі не спагналі запазычанасьці з кулакоў

Ні на хвіліну не паслабляць барацьбы за фінплян

Чарапашыя тэмпы

Апошняя дэкада маю не дала належнага пералому ў выкананьні пляну мабілізацыі сродкаў. Па папярэдніх зьвестках, выкананьне квартальн. пляну за апошнюю дэкаду мая павялічылася на 7 проц. На 1 чэрвеня выканана ўсяго 41,6 проц. квартальнага пляну. Па паасобных плацяжох квартальны плян выканан наступным чынам:

Пазыка „Пяцігодка“	а) вёска	22,5 проц.
	б) горад	44,7 „
Уклады ў ашчадкасы		23,4 „
Зварот с.-г. пазык		39.1 „
Акцыі Трактарацэнтру		63 0 „
Паі спажывецкай каапэрацыі;		
	а) горад	54,5 „
	б) вёска	27,6 „
Уклады і авансы па спажыў каапэрацыі;		
	а) горад	91,1 „
	б) вёска	101,3 „
Культзбор (горад)		41,4 „
Падаходны падатак		52,5 „
Прамысловы падатак		33,1 „
Падатак на звышпрыбытак		12,5 „
Абавязацельствы Сельгасснабу		0,1 „
Уступныя ўзносы па калгасах		45,9 „
Мэтавыя накапленьні па калгасах		35,4 „

Як і ў папярэднія дэкады, адстае ад пляну паступленьне ўзносаў па пазыцы «Пяцігодка» і выкананьне пляну па ашчадкасах. Яўна зрываецца плян паянжапленьня па вясковай сетцы спажывецкай каапэрацыі. Праца па распаўсюджваньні абавязацельстваў на сельска-гаспадарчыя машыны зусім не пачата.

Шэраг раёнаў ня толькі ганебна адстае, але нават не дасылае сваячасова зьвестак. Да 3 чэрвеня не даслалі зьвестак і не ўвайшлі ў зводку наступныя раёны: Віцебскі, Азарыцкі, Быхаўскі, Высачанскі, Веткаўскі, Вуль скі, Вушацкі, Грэскі, Дубровенскі, Жлобінскі, Коханаўскі, Краснапольскі, Капыльскі, Ляднянскі, Лёзьнянскі, Лельчыцкі, Лагойскі, Плешчаніцкі, Полацкі, Рагачоўскі, Расонскі, Сураскі, Уваравіцкі, Узьдзенскі, Чарэйскі, Чачэвіцкі, Чэрыкаўскі, Чэрвенскі, Шклоўскі.

Для выкананьня пляну 2-га кварталу ў чэрвені неабходна падвоіць гэмпы, даць рашучы адпор апартуністычным спадзяваньням на самацёк.

Я.

Не спаганяюць запазычанасьць з кулакоў

Вылучаныя РКК-РСІ брыгады абсьледвалі некалькі фінустаноў Старобінскага раёну па мабілізацыі сродкаў. Абсьледваньне паказала, што мабілізацыя сродкаў насельніцтва па Старобінскім раёне праходзіць нездавальняюча.

Падэмо некалькі прыкладаў, якія сьведчаць аб тым, наколькі фінансавыя і каапэрацыйныя працаўнікі мабілізавалі сваю ўвагу на выкананьне пляну па мабілізацыі сродкаў, як першага кварталу, таксама і другога.

Райспажыўсаюз, атрымаўшы плян ад БКС на першы квартал студзеня 1931 году, давёў гэты плян да нізавых таварыстваў 18 студзеня. У першым квартале плян выканан толькі на 37,2 проц. па паявых, па ўкладах заданьне зусім ня выканана.

Плян другога кварталу ад БКС атрыманы 22 сакавіка, а трапіў ён да нізавых сельпо толькі 3-га красавіка. На паявых узносах на 11 мая плян другога кварталу выканан толькі на 25 проц.

Ня лепш справа стаіць з мабілізацыяй сродкаў па лініі райдзяржбанку. Плян першага кварталу недавыкапан на 36 проц. На 15 мая мелася пратэрмінаваній запазычанасьці за аднаасобным сэктарам на 1.662 р., за калгасамі і інш. установамі—на 22.163 руб.

Трэба адзначыць, што спагнаньне пратэрмінаваных пазык ідзе вельмі марудна.

Заданьне па распаўсюджваньні акцый Трактарацэнтру таксама ня выканана. На 14 мая выканана заданьне на 51 проц. У гэтым правілі злачынную бязьдзейнасьць сельсаветы, леспрамгасы.

Праведзены па раёне двухдэкаднік па вывазцы лесаматар'ялу на набыцьцё акцый Трактарацэнтру належных вынікаў ня даў. Сельсаветы пасылалі сьпісы леспрамгасам, каб апошнія ўтрымлівалі грошы, але леспрамгасы грошай пры расплаце ня ўтрымлівалі.

На 15 мая лічыцца запазычанасьць за кулацкімі гаспадаркамі (па ўсіх відах плацяжоў)—24.566 руб. Ёсьць рад сельсаветаў, якія літасна адносяцца да кулакоў: напрыклад, Зажэвіцкі сельсавет не спагнаў з кулакоў грашовай запазычанасьці на 10.400 руб., Мецявіцкі—на 2.115 руб. Шмат ёсьць і па іншых сельсаветах.

Плян мабілізацыі сродкаў павінен быць выканан. Ніякай літасьці да кулака. За невыкананьне пляну па мабілізацыі сродкаў бязьдзейнікі павінны адказаць.

Шчавель.

Пра сацспаборніцтва ня ведаюць

Правядзеньне кампаніі па сельгаспадатку патрабуе ад партыйных, савецкіх і прафэсыянальных арганізацый належнай увагі і дапамогі.

Калі з боку Райвыканкому прыняты адпаведныя меры ў гэтым напрамку, дык прафарганізацыі і дзяржустановы **Гарадоцкага** раёну стаяць у баку ад гэтай гаспадарча-палітычнай кампаніі.

Ня сур'ёзныя адносіны наглядаюцца да правядзеньня кампаніі з боку некаторых сельсаветаў у асаблівасьці гарадзкога савету, які нават ня прыслаў працаўніка на інструкцыйную нараду, спасылаючыся, што нічога незразумелага няма.

Растлумачальная работа вельмі дрэнная. Пра сацспаборніцтва і ўдарніцтва ніхто ня ведае.

Прэзыдыум Райвыканкому за лепшае правядзеньне кампаніі растлумачальнай работы вызначыў 4 прэміі сельскім саветам. Адна прэмія—200 руб., дзьве—па 150 руб. і адна—100 руб. Складзена конкурсная камісія, на якую ўскладзен прысуд прэмій.

Парт'ячэйкі, сельсаветы павінны згуртаваць вакол сябе актыў для правільнага і пасьпяховага правядзеньня кампаніі.

Юрэвіч.

Мабілізацыя сродкаў—не кампанія

Мабілізацыя сродкаў па **Камарынскім** раёне зрываецца. Плян асобнага кварталу выканан на 75 проц., першы квартал—на 55 проц. і другі квартал на 10 мая выканан толькі на 25 проц.

Спажывецкая каапэрацыя выконвае свае пляны толькі на 12 проц. Акцыі Трактарацэнтру сярод некалгасьнікаў не распаўсюджаны.

У раёне не пастаўлена рашучая барацьба з кулацтвам. Так, напрыклад, па Баршчэўскім сельсавеце запазычанасьць за кулакамі даходзіць да 2.000 руб. у той час, калі кулацкая маемасьць не рэалізавана. Такія зьявішчы наглядаюцца і па Елчанскім і па інш. сельсаветах.

У выніку зрываецца будаўніцтва, зрываецца культурная і гаспадарчая работа па раёне.

Гэта тлумачыцца толькі тым, што раённыя арганізацыі не перабудавалі сваю работу тварам да выкананьня фінпляну. Райфо, райспажыўкаапэрацыя лічаць, што мабілізацыя сродкаў—гэта кампанія, а ня штодзённая работа.

Х. К—оў.

Замест 14.000 руб.—325

Райком камсамолу гор. **Сянно** ня справіўся з пастаўленымі перад ім задачамі, і ня выканаў дырэктывы ЦК ЛКСМБ па мабілізацыі вольных сродкаў насельніцтва ў ашчадкасы.

Райком Сеньнінскага раёну ўзяў на сябе абавязак на працягу студзень—сакавік 31 г. уцягнуць укладаў у ашчадкасу ў колькасьці 14.000 руб., а выканаў усяго на 325 руб., што складае ўсяго 3,3 проц. Сеньнінскаму камсамолу трэба не ігнараваць пастановы ЦК ЛКСМБ, а выконваць тыя абавязкі, якія ён на сябе ўзяў.

Да гэтага **часу** камсамольцы ўцягнуты ўкладчыкамі ў ашчадкасу ўсяго на 25 проц..

Астроўскі.

Пакласьці канец бязьдзейнасьці

Больш месяца прайшло з дню абвяшчэньня новага закону пра сельска-гаспадарчы падатак. А В. **Машчаніцкі сельсавет, Бялыніцкага раёну,** ні слова аб ім нідзе не сказаў. Тлумачыцца гэта бязьдзейнымі, апартуністычнымі адносінамі да такой важнай гаспадарча-палітычнай кампаніі. Сельсавет забыўся аб тым, што закон пра с.-г. падатак—гэта рычаг калектывізацыі і ўзмацненьня калгасаў.

Два разы склікаўся пленум сельсавету, дзе меркавалася паставіць пытаньне аб законе пра с.-г. падатак, але ні адзін член сельсавету не зьявіўся—справа на гэтым і скончылася. Агульныя сходы па вёсках ня склікаліся, і пытаньне гэта з сялянствам не прапрацоўвалася. Ні калгаснікі, ні сялянства, і наогул уся маса аб законе і пра ільготы, якія даюцца калгасам бядняцка-серадняцкім гаспадаркам, ня ведаюць.

Неабходна ўзяцца за гэтую справу і пакласьці канец такім адносінам да падатку.

Я. Канькоў.

Студэнты дамагаюць калгасу

Студэнты Менскіх 6-месячных пэдкурсаў і вучні 21 ФЗС выехалі ў калгас «Бальшавік» прыгараднага раёну, для аказаньня дапамогі калгасу ў скан чэньні сяўбы.

Студэнты і вучні, асабіста дапамаглі ў вывазцы гною і пасадцы бульбы.

Калгаснікі шчыра дзякавалі студэнтаў і вучняў за іх дапамогу.

Лішай Язэп.



Праэкт вялікай станцыі ў акіяне для пасадкі аэраплянаў. Плошча станцыі будзе ўзьнята над вадою 27 мэтраў.

ПА БССР

Плян загатоўкі яек выконваецца самацёкам

Ня гледзячы на тое, што за май і чэрвень месяцы павінна быць загатоўлена 75 проц. гадавога пляну яек, Крычаўскім, Мсьціслаўскім і Чэрыкаўскім райспажыўтаварыствамі гэты плян зрываецца. Яны не разгарнулі работы па ўдарнаму, а цалкам спадзяюцца на самацёк.

Ні ў адным райспажыўсаюзе не арганізавана сеткі карабейнікаў, не праводзілася ніякай растлумачальнай работы сярод жанчын, навакол загатовак не згуртавана грамадзкая думка калгаснікаў вакол гэтага пытаньня. Праўленьні адзначаных спажыўсаюзаў адгаварваюцца тым, што яйказагатоўкі «ня вельмі важная справа».

Характарна яшчэ і тое, што загатоўленыя яйкі ляжаць на складах па паўтары—два месяцы з-за адсутнасьці тары і посудзіны (Крычаўскі і Чэрыкаўскі раёны). **Белптушкапрадукт Аршанскай базы,** які павінен забясьпечыць загатоўкі тарай, на запатрабаваньні не адказвае ніводным словам.

Раённыя арганізацыі загатоўкамі яек ня цікавяцца.

Трэба работу па яйказагатоўках паставіць на ўдарныя тэмпы, каб гадавы плян поўнасьцю выканаць да 1-га ліпеня, арганізаваўшы прэміяваньне лепшых здатчыкаў яек.

К.

Забясьпечыць рабочыя цэнтры малаком

Мсьціслаўскі райспажыўсаюз ня выканаў у тэрмін дырэктывы аб кантрактацыі. На 25 мая плян кантрактацыі малака выканан па сацыялістычным сэктары на 95,8 проц. і па аднаасобным—на 65,8 проц.; паступіла-ж ад сацсэктара 0,72 проц. закантрактаванай колькасьці, ад аднаасобнага—1 проц. і па цьвёрдых заданьнях—0,26 проц.

Раённыя арганізацыі стаяць у баку ад гэтай работы. Шамоўскім сельсаветам з 16 вёсак кантрактацыя малака праведзена толькі ў аднэй, у Курманаўскім сельсавеце з 16 насельных пунктаў—у трох. Выконваюцца-ж кантракцыйныя дагавары зусім дрэнна. Райспажыўсаюз зусім не займаецца гэтай справай, а райком не правярае яго работы.

Казакоў.

Паход Аршанскага камсамолу за ахову ўраджаю

Ворша (наш кар.). У сувязі з пастановай ЦК УсеЛКСМ аб удзеле камсамолу ў ахове ўраджаю, камсамол Аршаншчыны ўзяў на сябе бад абавязкаў па ахове ўраджаю ў раёне і па дапамозе ў арганізацыі падрыхтоўкі да яго ўборкі.

Камсамол Аршаншчыны арганізуе ў кожнай калгаснай і саўгаснай ячэйцы камсамолу, плянава-арганізацыйныя групы, якія павінны будуць дапамагчы адміністрацыі, саўгасаў і праўленьням калгасаў у складаньні пляну ўборкі ўраджаю, добра падрыхтаваць уборачны інвэнтар, сваячасова яго адрамантаваць. Арганізуюцца маладзёжныя брыгады на ўсіх вучастках работы, разгортваецца сярод іх сацспаборніцтва і ўдарніцтва, а таксама работа маладзёжных брыгад ля машын у дзьве зьмены.

Камсамольская ахова ўраджаю цесна ўвязваецца з далейшым ростам калектывізацыі раёну і замацаваньнем калгасаў на аснове зьдзельшчыны. Ахова ўраджаю павінна будзе скончыцца канвэерам здачы хлеба на загатоўчыя пункты.

Кожнаму гарадзкому камсамольцу, гадзена заданьне прабыць у калгасе, альбо саўгасе ад трох да пяці дзён і дапамагчы практычна мясцовай камсамольскай ячэйцы арганізаваць камсамольскі паход за ахову і ўборку ўраджаю.

А. Кудрын.

Камунальнае будаўніцтва ў Мазыры

МАЗЫР, 3-6 (БЕЛТА). На камунальнае будаўніцтва па Мазыры зацьверджаны папярэдні бюджэт ў 1.500.000 руб. На пабудову лазьні і мэханічнай прачачнай адпушчана 85.000 руб., на пабудову гаражу—20.000 руб.

Камгас прыступае да будаўніцтва не дапушчальна марудна. З-за бязьдзейнасьці жыльлёва будаўнічай каапэрацыі не скарыстоўваюцца 25.000 р., што вызначаны на будаўніцтва кватэр для рабочых.

У гэтым годзе мяркуецца пабудаваць 13-кватэрны дом. Канчаюцца работы па замацаваньні набережнай ракі Прыпяці. Заключана ўмова з Вадаканалам на перабудову вадаправоднай сеткі гораду і пракладку новай магістралі да фэрмы ЦРК. Пачаліся работы па плянаваньні трох вуліц. Прыватны сэктар ня выконвае пастановы Гарсавету па рамбнце жыльлёвых памяшканьняў.

Праводзіцца падрыхтоўчая праца на перабрукаваньні вуліц. Па раёне закончваецца пракладка дарог эканамічнага значэньня. У гарадзкім садзе арганізуецца дзіцячая пляцоўка. Райпрафсавет слаба дапамагае гэтаму мерапрыемству.

Сарвалі нараду па пытаньні вярбоўкі шахцёраў

Наркампрацы разам з Беларускім упаўнаважаным аб'яднаньня «Уголь» склікаў на 4-е чэрвеня, а 1 гадзінную нараду па пытаньні ходу вярбоўкі шахцёраў для Данбасу. На нараду былі запрошаны прадстаўнікі Белкалгасцэнтру, ЦК ЛКСМБ і цэнтральных газэт. Але прадстаўнікі газэт і ЦК ЛКСМБ на нараду не зьявіліся і яе не давялося правесьці.

Нарада яшчэ раз склікаецца сёньня 5-га чэрвеня а 3 гадзіне дню ў памяшканьні Наркампрацы.

АПАВЯШЧЭНЬНІ

ПЭДГАБІНЭТ

5-VI у 19 гадзін—нарада заг. ФЗС, прадстаўнікоў камсодаў і вяжатых базамі. Даклады школ аб гадовай працы.

5-VI у 19 гадз.—канфэрэнцыя мовазнаўцаў. Даклад Замошіна, сістэматыка школ.

Заўтра

6-V у 19 гадз.—канфэрэнцыі матэматыкаў—даклад 20 школы прыродазнаўцаў—даклад 23 і 32 школ.

6-VI у 19 гадз.—сход грамадазнаўцаў, географаў і выкладчыкаў беларускай і расійскай мовы і літаратуры па пытаньні новых праграм.

Усе канфэрэнцыі прызначаныя ў пэдгабінэце на 8, 9, 10 і 11 адмяняюцца.

Адказны рэдактар П. ШАСТАКОЎ.

АБАВЯЗКОВАЯ ПАСТАНОВА

Менскага гарадзкога савету рабоча-сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў

Пра працоўную дарожную павіннасьць

3 чэрвеня 1931 г. № 17 г. Менск

У адпаведнасьці з пастановай ЦВК і СНК БССР ад 25 мая 1931 г. Менскі Гарадзкі Савет Рабочых, Сялянскіх і Чырвонаармейскіх Дэпутатаў **пастанаўляе:**

1. Увесьці на сельскай тэрыторыі прыгараднай мяжы Менгарсавету на 1931 г. бясплатную працоўную дарожную павіннасьць.

2. Да бясплатнай дарожнай працоўнай павіннасьці прыцягваецца мясцовае насельніцтва, калектыўныя гаспадаркі, камуны, сельска-гаспадарчыя арцелі, саматужна-прамысловыя арцелі, усе прыватныя прадпрыемствы і інш., якія карыстаюцца мясцовым дарогамі і стала знаходзяцца ў сельскіх мясцовасьцях і прыгарадных насельніцкіх пунктах, за выключэньнем асоб, вызваленых ад прац. дор. павіннасьці згодна арт. 4 гэтай пастановы.

Калгасы прыцягваюцца да дарожна-будаўнічых работ у парадку прац. дор. павіннасьці. Прыцягненьне рабочай і цягавай сілы на дарожныя работы павінна вытварацца на больш льготных умовах для калгаснікаў, чым для аднаасобнікаў.

Увага 1. Прыцягнутыя да прац. дор. павіннасьці жанчыны павінны скарыстоўвацца на менш цяжкіх работах.

Увага 2. Ня могуць прыцягвацца да прац. дор. павіннасьці адначасова ўсе члены сям'і.

3. Насельніцтва, гаспадаркі і прадпрыемствы, паказаныя ў арт. 2 гэтай пастановы прыцягваюцца да працоўнай дарожнай павіннасьці з рабочай жывёлай, апрача завадзкой, з патрэбнымі гужавымі і транспартнымі сродкамі і інвэнтаром. Гаспадаркі, якія ня маюць коняй, або інвэнтару прыцягваюцца без апошніх у выглядзе пешых рабочых.

4. Да працоўных дарожнай павіннасьці ня могуць прыцягвацца:

а) асобы, якім няма 18 год;

б) мужчыны ад 45 г. і жанчыны ад 40 гадоў і старэй.

в) цяжарныя жанчыны на час за 8 тыдняў да радоў і на працягу 8 тыдняў пасьля радоў.

г) жанчыны, што кормяць грудзьдзю.

д) жанчыны, якія маюць дзяцей да 8 гадоў пры адсутнасьці асобы, якая-б даглядала за імі.

е) інвалыды працы і вайны і непрацаздольныя.

ж) рабочыя (стальныя, часовыя і сэзонныя) дзяржаўных, каапэрацыйных і прыватных прадпрыемстваў, а таксама батракі, якія ня маюць уласнай гаспадаркі ў данай мясцовасьці.

з) асобы, што знаходзяцца на службе ў дзяржаўных, грамадзкіх і каапэрацыйных установах і прадпрыемствах.

Увага: 1. У паасобных выпадках у залежнасьці ад матар'яльнага стану, ад стану здароўя і іншых важных прычын, сельскі савет можа адтэрмінаваць, альбо аслабаніць ад працоўнай дарожнай павіннасьці, асоб не прадугледжаных гэтым пералікам.

Гэтакія выпадкі сельсавет павінен даслаць на зацьверджаньне Прэзыдыуму Гарсавету.

Увага 2. Служачыя ў прадпрыемствах, асобы, якія маюць свае сельскія гаспадаркі, прыцягваюцца да прац. дор. павіннасьці па тэй катэгорыі, да якой падыходзяць іх гаспадаркі з заменай натуральнай павіннасьці грашыма з разьлікам устаноўленым арт. 6 і 7 гэтай пастановы.

5. Забараняецца прыцягненьне да дарожнай павіннасьці ў пэрыяд інтэнсыўнай сельска-гаспадарчай работы (палявыя работы), гэты пэрыяд забароны ўстанаўліваецца для вясеньняй з 1 мая па 10 чэрвеня і для асеньняй з 15 ліпеня па 1 верасьня.

6. Замест натуральнага выкананьня працоўнай дарожнай павіннасьці, грамадзяне, гаспадаркі і прадпрыемствы, прыцягваныя да прац. дор. павіннасьці ў парадку арт. 2 могуць з дазволу сельсавету ўносіць належную грашовую суму, паказаную ў арт. 7.

7. Разьмер грашовай замены рабочага дню ўстанаўліваецца:

а) для індывідуальнага абкладаньня гаспадарак і ім роўных: без каня—12 р. з канём—24 руб.

б) аднаасобнікаў, абкладаных сельска-гаспадарчым падаткам з надбаўкай: без каня—8 руб., з канём—16 р.

в) Для аднаасобнікаў, абкладаных у звычайным парадку: без каня—6 р., з канём—12 руб.

г) Для аднаасобнікаў, вызваленых ад сельска-гаспадарчага падатку без каня—4 р., з канём—8 руб.

д) Для калгаснікаў з канём—8 руб., без каня—4 руб.

Увага: заявы аб замене натуральнай павіннасьці грашыма падаюцца сельскаму савету не пазьней як за два тыдні ад дню абвяшчэньня гэтай пастановы. Грошы замест замены ўносяцца ў 3-х дзённы тэрмін па атрыманьні паведамленьня Сельскага Савету аб дазволе замяніць натуральную павіннасьць грашыма.

8. Лік дзён прыцягненьня да прац. дар. павіннасьці ў год для кожнай працаздольнай асобы ўстанаўліваецца, выходзячы з ніжэйпералічанага па катэгорыях.

а) для гаспадарак, абкладзеных сельска-гаспадарчым падаткам у індывідуальным парадку бяз жывёлы—6 дзён, з жывёлай—100 проц.;

б) для гаспадарак, абкладзеных сельгаспадаткам з працэнтнай надбаўкай бяз жывёлы—5 дзён, з жывёлай—100 проц.;

в) гаспадарак абкладзеных сельгаспадаткам у звычайным парадку—бяз жывёлы—4 дні, з жывёлай—100 проц.;

г) для гаспадарак, аслабаненых ад сельгаспадатку бяз жывёлы—3 дні, з жывёлай—50 проц.;

д) калектыўныя гаспадаркі прыцягваюцца да прац. дар. павіннасьці па нормах ня вышэй устаноўленых для гаспадарак, абкладаных сельгаспадаткам у звычайным парадку.;

е) уладары прыватных прадпрыемстваў, арандатары дзяржаўных і каапэрацыйных прадпрыемстваў і члены іх сем'яў прыцягваюцца за кожнага працаздольнага члена сям'я бяз жывёлы 6 дзён, з жывёлай 100 проц.;

ж) саматужна прамысловыя, вытворча-каапэрацыйныя аб'яднаньні і саматужнікі адзінкі аслабаненыя ад прыбытковага падатку прыцягваюцца па нормах устаноўленых для гаспадарак абкладаных сельгаспадаткам у звычайным парадку (гл. п. «в»);

з) саматужнікі, маючыя 1 наёмнага рабочага, альбо 2 вучняў, працягваюцца па нормах устаноўленых для груп гаспадарак, абкладзеных сельгаспадаткам з надбаўкай (гл. п. «б»);

і) саматужнікі, маючыя рабочых і вучняў звыш нормы, паказанай у п. «з» прыцягваюцца па нормах устаноўленых для індывідуальна-абкладаных гаспадарак (г. п. «а»);

к) іншыя групы насельніцтва падлягаючыя прац. дар. павіннасьці, гандляры, служачыя культаў, асобы вольных прафэсій і г. д. прыцягваюцца да прац. дар. павіннасьці па нормах, устаноўленых для індывідуальна абкладаных гаспадарак (гл. п. «а»);

9. Забараняецца прыцягненьне насельніцтва да адбываньня натуральнай прац. дар. павіннасьці у тых выпадках, калі аб'ект работ знаходзіцца ад месца жыхарства, прыцягванага ў першым парадку на адлегласьці звыш 10 кіл., а пры падвозцы матар'ялаў звыш 25 кіл. за выключэньнем тых выпадкаў, калі насельніцтва дабраахвотна пажадае адбываць прац. дар. павіннасьць на адлегласьці больш вышэйпаказанага

10 За няяўку для адбываньня дарожнае павіннасьці накладаецца адміністрацыйным парадкам штраф у разьмеры да 5-ці разовага кошту працы, а на кулакоў да 10-ці разовага кошту працы, якая прыпадае на даную асобу, пры чым у кулакоў забіраецца рабочая жывёла на той час, які яны лаўінны былі адпрацаваць.

11. Сумы, сабраныя ад штрафу і ад замены натуральнай прац. дар павіннасьці, згодна арт. 6, 7 і 10 гэтай пастановы, павінны выдаткоўвацца выключна на гэтыя работы і на эксплёатацыйныя дарожныя выдаткі, строга па пляну зацьверджанаму Гарсаветам.

12. Дазваляецца замена за першыя дні з канём за два дні пешых адзін дзень з канём.

13. Асобы, вінаватыя ў выкарыстаньні прац. дар. павіннасьці на работы, якія не адносяцца да дарожнай справы, ці не ў гаспадарчым скарыстаньні працоўнага ўдзелу насельніцтва ў дарожных работах прыцягваюцца да крымінальнай адказнасьці.

14. Гэта пастанова набывае моц праз 7 дзён з часу выданьня.

15. Нагляд за выкананьнем гэтай пастановы ўскладаецца на дарінспэктара Гарсавету, сельсавет і міліцыю.

Старшыня Менгарсавету **ВАЛОДЗЬКА**
За сакратара **ТАРАСІК**

ЦЫРК-КІНО-ТЭАТР

Дзярж-ЦЫРК — ВЯЛІКІ ЦЫРКАВЫ ПАКАЗ. Група дрэсіраваных вярблюдаў пад кір. драс. Лапіада і шмат інш. №№ жывотных. Пачат. а 8 ч. 45 х. увечары. Льготныя білеты ў рабкасе

„Чырвоная Зорка“ — Амэр. прыгодн. фільм ЛЯГУНА ПЭРЛАЎ. Кіно-хрон ка Саюзкіно № 26. Пач. а 7, 8 45. 10 30 г. Каса адч. з 5 гадз.

Кіно-тэатр „Культура“ — Новы фільм Чалавек за бартом Драма ў 6 частках. Звыш програмы кіно-хроніка Саюзкіно. Пачатак а 7 гадз. Каса адч. з 5 г.

Кіно ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ — Партфэль дыпкур'ера. Пачатак а 7 гадзіне ўвечары.

Кіно „ПРАЛЕТАРЫ“ — 2 фільмы ў адзін сэанс. 1. ДОМ НА ТРУБНОЙ у 6 частках. 2. РАДЫЁ І ЛЕЎ у 6 частках. Пачатак 1 сэансу а 2 г. дня

БЕЛДЗЯРЖВЫДАВЕЦТВА — СЭКТАР КНІГАРАСПАЎСЮДЖВАНЬНЯ
ДАКТАРАМ І СТУДЭНТАМ
Д-р М. Н. ШАПІРА і д-р Б. Н. ЦЫПКІН
Уводзіны ў практычную ортопэдыю
Цана 1 р. 45 к. у аправе. Тыраж 3.000
Прадаецца ва ўсіх кнігарнях Белдзяржвыдавецтва, Спажыўкаапэрацыі і Саюздруку

ТОРФАЗАВОД „ПРАЛЕТАРЫ“ пры ст. Дрэтунь МБЕ чыгункі
ЛІКВІДУЕЦЦА
Усе прэтэнзіі да заводу прад'яўляць ліквідкому заводу да 15 чэрвеня 31 г.
ПАСЬЛЯ вызначанага ТЭРМІНУ ПРЭТЭНЗІІ БУДУЦЬ ЛІЧЫЦЦА несапраўднымі
Белторф

БЕЛГАНДАЛЬ
АДЧЫНІЎ па Ленінскай, 10
МАГАЗЫН ГАТОВАГА АДЗЕНЬНЯ
ЖАНОЧЫЯ КАСЬЦЮМЫ І ПАЛІТО МУЖЧЫНСКІЯ КАСЬЦЮМЫ І ПАЛІТО, ГАЛЯНТАРЭЯ, ШЛЯПЫ І ІНШЫЯ ТАВАРЫ.
УСЕ ТАВАРЫ МАЮЦЦА У ВЯЛІКІМ ВЫБАРЫ
ЦЭНЫ ПА ПРЭЙСКУРАНТУ
ПРАДАЖА ЎСІМ
Белгандаль

Адрас рэдакцыі і выдавецтва: Менск, Пляц Волі, 17, першы паверх. Тэлефоны: адказнага рэдактара—7-69, сакратара—4-78, сэктараў—6-15. Выдавецтва—2-44
Падпісная плата: 1 месяц—90 к., 3 м-цы—2,70, 6 м-цаў—4,00, на год—8,00.

Галоўлітбел № 598.

Друкарня імя тав. СТАЛІНА.